Ба60528

БА 60528ф
мф 1344

# БЮЛЕТЭНЬ
## ПЛЕНУМУ ЦЭНТРАЛЬНАГА БЮРО ЎСЕБЕЛАРУСКАГА АБ‘ЯДНАНЬНЯ ПОЭТАЎ І ПІСЬМЕНЬНІКАЎ
# МАЛАДНЯК

Бел. аддзел
1994 г.

21—23 сакавіка 1925 г.

VII
18869

ВЫДАНЬНЕ ЦБ „МАЛАДНЯК“
М Е Н С К—1925 г.

ОДЕССКАЯ ГОСУДАРСТВЕН.
29 ИЮН 1925
ПУБЛИЧНАЯ БИБЛИОТЕКА

25.04.2009

Менск, 1-ая Дзярж. друкарня. Зак. № 2734. У ліку 6000. Галоўлітбел № 8435.

# Ад рэдакцыйнай комісіі.

Дзякуючы браку матар'яльных сродкаў, ЦБ ня мела магчымасьці даць у друк стэнографічную справаздачу—справаздача даецца па звычайных сакратарскіх запісах.

Дзеля гэтага магчымы некаторыя недакладнасьці ў паасобных прамовах, якія скарочаны на 75%.

Цэнтральнае Бюро „Маладняка“ лічыць, што рабоча-сялянскія масы, з шэрагаў якіх вышлі маладнякоўцы і для якіх яны працуюць увесь час,—павінны ведаць аб тэй працы, якую маладнякоўцы праводзяць на трэцім фронце савецкага будаўніцтва—культурным.

Цэнтральнае Бюро спадзяецца, што комуністыя, комсамольцы, піонэры, усе актыўныя культурныя працаўнікі, а ў першую чаргу настаўніцтва зробяць усё магчымае для пашырэньня нашых культурных дасягненьняў у рабоча-сялянскіх гушчах.

## АДЧЫНЕНЬНЕ ПЛЕНУМУ.

*Пасяджэньне 21-га сакавіка 1925 г.*

Пасяджэньне Пленуму Цэнтральнага Бюро Ўсебеларускага Аб'яднаньня поэтаў і пісьменьнікаў „Маладняк“ адчыняе старшыня ЦБ тав. Ажгірэй (Вольны), які прапануе абраць прэзыдыум.

Ад імя фракцыі агалашаецца сьпіс: М. Кудзелька (Чарот), А. Вольны, К. Атраховіч (Крапіва). Ганаровымі сябрамі прэзыдыуму—У. М. Ігнатоўскі (ад ЦК КПБ) і А. Гаруновіч (ад ЦК ЛКСМБ). Сакратарыят: А. Якімовіч і Я. Падабед.

Пропозыцыя фракцыі прымаецца аднагалосна.

Чарот: Прапаную ўшанаваць устаньнем памяць старшыні ЦВК СССР т. Нарымана Нарыманавіча Нарыманава, як выдатнага рэволюцыянэра і вядомага грамадзянскага дзеяча, а разам з тым і як пісьменьніка каўкаскіх народнасьцяй.

Я прапаную прывітаньняў не заслухоўваць, а перайсьці адразу да сталай працы.

Вольны (ставіць на галасаваньне).

Пропозыцыя прымаецца.

Чарот. Сьпіс устаноў і організацый, якія выказалі жаданьне вітаць пленум, будзе агалошаны на апошнім пасяджэньні, калі гэта прызнае патрэбным пленум.

Парадак дню прапануецца наступны:

1) Месца „Маладняка“ ў беларускай літаратуры.
2) Справаздача ЦБ і філій.
3) Рэорганізацыя ЦБ.
4) Плян далейшай працы.
5) Інформацыя аб зьезьдзе „Гарт“.
6) Інформацыя аб усесаюзнай нарадзе пролетпісьменьнікаў.
7) Бягучыя справы.

Чарот (ставіць на галасаваньне).

Прымаецца аднагалосна.

Чарот (старшыня прэзыдыуму). Па першаму дакладу слова даецца Адаму Бабарэку.

# „Маладняк“ і яго месца ў літаратуры.

У апублікаванай „замест дэклярацыі“ („Маладняк“ № 6) „Маладняк“ адзначаны, як „усебеларускае аб‘яднаньне поэтаў і пісьменьнікаў, якія згуртаваліся дзеля таго, каб ідэі матар‘ялізму, марксызму і ленінізму ажыцьцёвіць у беларускай мастацкай творчасьці“. Такая формуліроўка вызначае сутнасьць ідэолёгічнай пляцформы „Маладняка“.

Трыма словамі—„матар‘ялізм, марксызм і ленінізм“—мы рэзка адмежавалі сябе ад усякіх іншых пісьменьнікаў, вызначылі сваё сьветаразуменьне, наогул і ў прыватнасьці, на будову і гісторыю чалавечай грамады. Мы рэзка адмежавалі сябе ад усялякіх ідэалістычных і эклектычных сьветаглядаў і вызначылі сваё месца ў процэсе клясавага змаганьня і соцыялістычнага будаўніцтва.

Гэтым адзначэньнем ужо вызначаліся і самыя задачы працы „Маладняка“ па галінах крытычнай, творчай і „рэалізацыйнай“, вызначаўся характар мэтодаў гэтай працы.

Пераняесеньне мэтодаў з дыялектычнага матар‘ялізму, з грамадзкіх навук, з практыкі рэволюцыйнага змаганьня ў практыку мастацкай працы—вось сэнс і сутнасьць вышэйазначанай ідэолёгічнай пляцформы „Маладняка“.

І сапраўды, чаму-б Ленінскі спосаб працы, Ленінскі мэтод у практыцы рэволюцыйнага змаганьня не перанесьці ў практыку мастацкай творчасьці, у практыку крытычнай ацэнкі момантаў літаратурнага жыцьця-руху? І сапраўды, чаму-б не карыстацца тэорыяй пазнаньня дыялектычнага матар‘ялізму ў далажэньні яе да мастацкіх проблем, да будаваньня тэорыі літаратуры і г. д.

Усё гэта патрэбна рабіць, і „Маладняк“ да некаторага стопню ўжо зрабіў некалькі крокаў у напрамку да разьвязаньня вызначанай задачы. Крытычныя выступленьні маладнякоўцаў як у прэсе, так і на вечарох-дыспутах, зьяўляліся першымі, быць можа, не заўсёды сьмелымі спробамі рабіць гэтыя крокі. Але цяпер, калі „Маладняк“ стыхійна разросься, трэба цьвёрда вызначыць лініі для ажыцьцяўленьня пастаўленай задачы, трэба конкрэтызаваць свае пагляды на сутнасьць мастацкай літаратуры, яе асобныя элемэнты, на яе процэс разьвіцьця.

Гэта патрэба тым больш павялічваецца, што пачынаюць узьнімацца галасы і на беларускіх крытычна-літаратурных загонах з трактоўкаю пытаньняў мастацкай літаратуры, калі ня зусім адкрыта ў ідэалістычным духу, то выцягваючы для заслоны нават і матар‘ялізм і марксызм.

Так, пара ўжо цьвёрда сказаць, што мастацкая літаратура зьяўляецца зброяй клясавай барацьбы, а ў руках

пролетарыяту і сялянства—зброяй і социялістычнага будаўніцтва. Гэта адносіцца і да літаратуры беларускай.

І сапраўды, што такое па сваёй сутнасьці мастацкі твор? Калі глядзець на яго з боку тэй асобы, якая яго творыць, то ён зьяўляецца ні больш ні менш, як і ўсякі продукт чалавечай працы-творчасьці, толькі формаю матар'ялізацыі, у даным выпадку сродкамі мовы, а цераз гэта і формаю об'ектывізацыі зьместу пэўнага стану сьвядомасьці поэты ці пісьменьніка. І ясна, калі ў творцы сьвядомасьць клясавая, а яна заўсёды такая, ці хоча таго ці ня хоча прызнаваць сам пісьменьнік, то й матар'ялізаваны і об'ектывізаваны зьмест яе ў мастацкім творы носіць адзнакі гэтай клясавасьці. Ён прасякнуты тэлеолёгічнасьцю і імкнёнасьцю такой, што адпавядае тэй клясе ці групоўцы, да якой належыць аўтар твору.

З другога боку, мастацкі твор ужо, як канчатковы вынік творчага процэсу, становіцца об'ектам, які можа ўплываць (і ўплывае) на нашы пачуцьці і выклікаць тыя ці іншыя адчуваньні, формаваць волю ў бок пэўнай накіраванасьці. Такім чынам, што ў першым выпадку зьяўлялася формаю, у другім зьяўляецца зьместам нашых думак, матар'ялам нашых пачуцьцяў і адчуваньняў. І ясна, што і ў гэты момант клясавая сьвядомасьць поэты, об'ектываваная ў мастацкім творы, робіць сваю справу, формуючы волю і мысьлі чытача ў бок накіраванасьці тэй клясы, да якой належыць і аўтар твору, у бок інтарэсаў яго клясы.

Такім чынам, як бачым, прырода і значымасьць мастацкага твору функцыянальная. У абудвых выпадках ён зьяўляецца зброяй клясавай барацьбы.

Да рэчы сказаць, што на аснове гэтай функцыянальнасьці мастацкага твору выплывае тоежсамасьць паняцьцяў формы і зьместу, як выходных пунктаў пры дасьледваньні продуктаў мастацкай творчасьці. Словам устанаўляецца моністычны погляд на сутнасьць мастацкіх твораў, што адпавядае монізму, як выходнаму пункту ў тэорыі пазнаньня дыалектычнага матар'ялізму.

Так, мастацкі твор—гэта зброя клясавай барацьбы. У руках пролетарыяту і сялянства ў часе мірнага будаўніцтва мастацкі твор становіцца адным са сродкаў социялістычнага будаўніцтва. Адгэтуль выплывае задача — аўладаць пролетарыяту і сялянству такой магутнай зброяй і сродкам, як мастацкая літаратура—гэтай сыстэмай мастацкіх твораў. На беларускіх загонах „Маладняк" якраз і высунуты жыцьцём, вынесены хвалямі Кастрычнікавай рэволюцыі, каб разьвязаць гэту задачу. Апанаваць беларускай мастацкай літаратурай і сьвядома карыстацца ёю, як зброяй і сродкам у інтарэсах пролетарыяту і сялянства, у інтарэсах рэволюцыі

і яе перамогі на мірным будаўнічым фронце,—так мысьліцца нам задача „Маладняка“.

Шлях да яе разьвязаньня „Маладняк“ выбраў правільны. Гэта ня шлях поэтаў і пісьменьнікаў буржуазнага грамадзтва, ня шлях індывідуалістычнага апанаваньня літаратурай, ня шлях літаратурнай конкурэнцыі. „Маладняк“ пашоў шляхам, агульным для пролетарыяту, а іменна, шляхам колектыўнай організаванасьці. Колектывам і праз колектыў, організаваным шляхам, пры таварыскай узаемадапамозе—да апанаваньня літаратурай. Правільнасьць выбранага шляху сьцьвярджае і такі факт, як стыхійны рост „Маладняка“ ў колькасных адносінах за лік рабочай і сялянскай моладзі. Гэта тая моладзь, якая сазнала ўсё значэньне такой зброі ў руках пролетарыяту і сялянства, як мастацкая літаратура, і прызнала адзіным шляхам апанаваньня яго—„Маладняк“.

Такое становішча сучаснага моманту ў беларускай літаратуры высоўвае перад намі цэлы рад конкрэтных задач, шляхі да разьвязаньня якіх мы і павінны тут, на пленуме, намеціць. Зазначу самую галоўную, а іменна: апанаваць усімі мастацкімі формамі і прыёмамі творчасьці і навучыцца ўмела імі карыстацца ў інтарэсах пролетарскае справы, справы Кастрычнікавай рэволюцыі. Ад разьвязаньня гэтай задачы залежыць будучына беларускай пролетарскай літаратуры, а таксама і іншых галін мастацтва, паколькі „Маладняк“ пачынае ўжо ахопліваць іх.

Важнасьцю і вялікім значэньнем задач, што стаяць перад „Маладняком“, вызначаецца і яго месца ў сучасным моманце разьвіцьця беларускай літаратуры і наогул беларускай культуры. „Маладняк“—гэта яе будучына.

Але прыгледзімся бліжэй да сучаснага моманту сьцісла літаратурнага жыцьця-руху, каб конкрэтней вызначыць месца і ролю ў ім „Маладняка“. Дзеля гэтага хоць бегла трэба кінуць вокам на мінулае беларускай літаратуры.

Асаблівасьць літаратурнага жыцьця-руху на беларускіх загонах з самага, бадай, яго пачатку зьмяшчаецца ў тым, што тут няма і ня было прадстаўнікоў ад процілеглай пролетарыяту і сялянству сілы, а іменна, ад сілы капіталу—буржуазіі і памешчыкаў. Гэта асабістасьць адбілася і на мастацкай творчасьці, на характары разьвіцьця яе напрамкаў аж да сучаснае пары. На беларускай літаратурнай мове мы не знаходзім да крайнасьці разьвітых такіх форм мастацкай творчасьці, якія звычайна азначаюцца романтызмам, сымболізмам, рэалізмам, футурызмам і інш.

Праўда, некаторыя элемэнты гэтых напрамкаў ужываліся і ўжываюцца яшчэ і цяпер некаторымі поэтамі беларускімі, як сродкі для ажыцьцяўленьня тых ці іншых ідэй. Гэтыя элемэнты ў мінулым падпарадкаваліся агульнай імкнёнасьці да адраджэньня Беларусі, а ў даным выпадку—беларускай літа-

ратуры. Калі выражаць літаратурныя напрамкі праз „ізмы“, то я-б гэтую агульную форму ў разьвіцьці беларускай літаратуры да нашага часу назваў адраджанізмам. Гэта форма на беларускіх загонах знашла сваё поўнае ажыцьцяўленьне, асабіста скарыстаўшы некаторыя элемэнты такіх форм, як клясыцызм, сантымэнталізм, романтызм, рэалізм, сымболізм, імпрэсыонізм і інш.

Так, прыкладам, Янка Купала карыстаў элемэнты сымболізму для стварэньня хоць-бы такіх твораў, як „Сон на кургане“, „Раскіданае гняздо“, „На папасе“, „Курган“ і інш. Але-ж у Я. Купалы не знаходзім асноўнае адзнакі сымболізму, гэта пагляду, што жыцьцё і ўсе зьявы на зямлі і ў прыродзе зьяўляюцца толькі адбіткамі, сымболямі сьвету нявідзімага, невядомага. „Сымболізм“ Я. Купалы асаблівы, ён падпарадкаваны адраджанізму.

Тое-ж самае можна сказаць і пра другіх поэтаў і пісьменьнікаў—равесьнікаў Янкі Купалы. Уся розьніца між імі толькі ў пераважнасьці тых ці іншых сродкаў, пры дапамозе якіх яны імкнуліся ажыцьцёвіць адраджанізм. Так, у Я. Коласа знаходзім пераважнасьць элемэнтаў „рэалізму“, атуленых дымкаю „романтызму“, якая выяўляецца хоць-бы ў адушаўленьні прыроды. „Усё жыве і душу мае“, кажа Колас вуснамі Сымона Музыкі.

У пакойнага М. Багдановіча бачым перавагу элемэнтаў „імпрэсыонізму“, зноў-жа такі падпарадкаваных адраджанізму. Багдановіч карыстае іх толькі дзеля таго, каб мацней ударыць у сэрцы людзей, каб іх большы лік згуртаваць, бо яго непакоіць думка, ці хваціць сілы „грамадзкае гора змагці“. Пад напорам гэтай думкі Багдановіч карыстае элемэнты „імпрэсыонізму“, каб паказаць хараство і чароўнасьць роднага краю і праз гэта ўзмацаваць любасьць да гэтага краю ў другіх.

Зьмітрок Бядуля зноў-жа такі з усё той-жа асноўнай мэтаімкнёнасьцю карыстае элемэнты „містыцызму“.

Як бачым, першая адзначаная асабістасьць у разьвіцьці беларускай літаратуры не прывяла нашых папярэднікаў да станаўленьня тэй ці іншай мастацкай формы, як самамэты, як цалкавітага сьветагляду, што знаходзіў сваё ажыцьцяўленьне ў такіх напрамках, як романтызм, сымболізм і інш. Яна дала толькі свой асабісты, самабытны, закончаны напрамак—*адраджанізм*.

Але, апроч першай асабістасьці ўжо ў напрамку адраджанізьме ў перадкастрычнікаўскую эпоху, накладала свой адбітак і другая асабістасьць. Гэта асабістасьць у літаратурным руху зьяўлялася адбіткам асабістасьці становішча дзейных сіл грамадзкага руху. Апроч сялянства, на арэну грамадзкага руху на беларускіх загонах пачала дзейнічаць другая сіла—сіла работніцкай клясы, якой, воляю гісторыі, прысуджана было стаць піонэрам у барацьбе за соцыялізм і комунізм.

Выявіцелямі гэтай асаблівасьці грамадзкага руху ў мастацкай літаратуры былі Цётка, Цішка Гартны і часткова Алесь Гарун і наш старэйшы маладняковец А. Гурло. Гэтыя літаратурныя сілы дзейнічалі ў рамках адраджанізму. Але ў іх вобразах матар'ялізаванага зьместу сьвядомасьці адчувалася новая плынь, характарызуемая мэтаімкнёнасьцю да агульнага соцыяльнага вызваленьня, а ня толькі нацыянальнага. Гэта плынь, у нашу пару разьвіваючыся ў постаці „Маладняка", убіраючы здаровыя элемэнты і дасягненьні адраджанізму, разрастаецца ў новы літаратурна-грамадзкі напрамак, калі называць праз „ізм", то—*маладнякізм*, як проціваставленьне адраджанізму. Адраджанізм вырас у маладнякізм. Засевы папярэдняй, дакастрычнікавай пары ня толькі ўзышлі, але ўжо рунеюць Чырвоным Маладняком.

Такі грунт пад сучасным становішчам беларускай літаратуры.

Перш, чым перайсьці да ацэнкі „сучаснага моманту" ў разьвіцьці беларускай літаратуры, трэба ўстанавіць, якога становішча грамадзкага руху *яна* зьяўляецца адбіткам.

Асабістасьць сучаснага становішча грамадзкага руху зьмяшчаецца ў тым, што на арэне беларускіх загонаў асноўнаю дзейнаю сілаю зьяўляецца рабочая кляса. Яна, замацоўваючы саюз з бядняцкім і серадняцкім сялянствам, зьяўляецца галоўнай дзейнай сілай у барацьбе за соцыялізм і комунізм. Апроч гэтай асноўнай сілы, ёсьць яшчэ і другазначныя, як кулакі, мяшчане, нэпманы,—гэтыя асколкі другой асноўнай сілы, якая дзейнічае на міжнароднай арэне, а іменна—сілы капіталу. Між гэтымі сіламі прамежнае становішча займае так званая „інтэлігэнцыя", якая часта хістаецца ў рашучыя моманты барацьбы і ўрэшце альбо далучаецца актыўна да тэй ці іншай стараны, або займае так званае „нэйтральнае" становішча, што фактычна значыць пасыўнае далучэньне да тых ці другіх.

Вось гэта асабістасьць сучаснага становішча грамадзкага руху ў пэўнай меры адбіваецца і на становішчы літаратурнага жыцьця-руху.

На беларускіх загонах у сучасны момант дзейнічаюць такія сілы, як Янка Купала, Якуб Колас, З. Бядуля, М. Грамыка, Цішка Гартны і колектыўная сіла „Маладняк". Гэта апошняя і самая галоўная якраз ужо сваёй організаванасьцю сама па сабе зьяўляецца сустаўной часткаю галоўнай дзейнай сілы грамадзкага руху, а ў літаратурным руху—яе адбіткам. Як у грамадзкім руху галоўная задача цяпер—гэта замацаваньне сувязі гораду з вёскаю на аснове падняцьця дабрабыту сельскай гаспадаркі, павялічэньня продукцыйнасьці працы і разьвіцьця беларускай нацыянальнай культуры (усё гэта, як прадпасылка ўзмацаваньня дзейнай сілы рэволюцыі на міжнароднай арэне), так і ў „Маладняку" задача гурта-

ваньня сіл маладняцкіх, што прадстаўляюць і горад і вёску, і ўзмацаваньне гэтай згуртаванасьці на аснове павялічэньня колектыўнай працы па аўладаньню беларускай мастацкай літаратурай, як зброяй клясавай барацьбы.

Што-ж належыць рэшты азначаных мною індывідуальных сіл у сучасным становішчы беларускага літаратурнага руху, то адны з іх і да гэтай пары стаяць, як быццам, на старых позыцыях. Не дааценіўшы пераходу аднэй паласы літаратурнага руху ў другую, некаторыя з іх удаюцца ў разьвіцьцё самамэтных напрамкаў з тых элемэнтаў, якімі раней яны карысталіся, як сродкамі. Так, аб гэтым яскрава гаворыць хоць-бы і зборнік Купалы „Безназоўнае“. Тут ужо бачым паглыбленьне сымболізму, як мэты.

Спачатку яно шалясьцела
Вельмі нясьмела,
А потым лізнула ваконца
Ціха, як сонца.

Як бачыце, „яно“ тут—„безназоўнае“, сымболь быццамбы невядомага, нявідзімага, мо‘ нават таго, што знаходзіцца за межамі дасягаемасьці.

Тое самае і ў Коласа. Яго „Новая Зямля“ ўжо, згодна прыпісцы самога аўтара, зьяўляецца фактычна старою зямлёю, ды яшчэ атуленай дымкай пэсымізму.

...Ніхто з граніц сваіх ня выйдзе,
З законаў жыцьцем напісаных...

Або „Водгульле“, вышаўшае ў 1922 годзе. Гэта—водгульле адраджанізму.

Праўда, у апошні час іх „орыентацыя“ як-бы зьмяняецца. Часамі спатыкаюцца іх творы ў „Маладняку“ і ў „Полымі“, якія сьведчаць аб замерах пераступіць „канаву“, перад якою былі апынуліся поэты старэйшага пакаленьня. Трэба толькі сьцьвердзіць, што адраджанізм у асобах Я. Купалы і Я. Коласа на нашых вачох завяршае апошні этап свайго разьвіцьця. Адно выйсьце для яго прадстаўнікоў—гэта прыслухоўвацца да колектыўнай сілы, каб не апынуцца перад тварам апаскі—стаць выяўнікамі прамежных груповак грамадзкага руху.

Другая група, Ц. Гартны, З. Бядуля і М. Грамыка, пяе ў тон рэволюцыі з прыметнай імкнёнасьцю таксама да разьвіцьця самамэтных напрамкаў з тых элемэнтаў, якія раней для іх служылі толькі сродкамі. Так, Ц. Гартны творыць такія вобразы, як „Трэскі на хвалях“, „сымфоніі“, нават сонца на дыбы ставіць. Не дарма адзін з маладнякоўцаў, нібы ў адказ на гэта, крыкнуў на сонца „ня суньса са мной на нажы“. Ранейшыя вобразы Ц. Гартнага—багатшыя і сачнейшыя. Успомніць хоць-бы „Сокі Цаліны“. Але Ц. Гартны не заўважыў, як з сокаў цаліны ўжо ўзрос маладняк.

Так-жа можна ахарактарызаваць і позыцыю З. Бядулі. У зборніках „Пад родным небам“ (1922 г.), а пазьней „На зачарованых гонях“ мы бачым паглыбленьне ў разьвіцьці таго, што раней служыла толькі сродкамі, у свой самабытны напрамак, атулены дымкай містыцызму. Але вось рэволюцыя перамагае, і ў Бядулі пералом. Ён пяе ёй у тон. Пасьля „Пад родным небам“, „На зачарованых гонях“—раптоўна „Буралом“. Гэта вобраз буралому самога адраджанізму з яго ўхіламі ў сымболізм. Не дарма Бядуля тут заклікае і другіх:

Апраніся ў сьвяточную сьвітку,
Кінь у тхлань паднявольніцу-спадчыну,
Адгані думкі цьмы—недабіткі
З кроснаў матчыных!

Бо „Маладняк параджае багата“. У яго праявы жыцьця, праявы грамадзкага руху ажыцьцяўляюцца ў вобразах зусім інакшага характару. Тут няма буралому, спадчыны, водгульля, безназоўнага, трэсак на хвалях. Тут бачым „у віры жыцьця“ „Беларусь лапцюжную“, „бунтарскую“ ўжо на „беларускім бруку“.

Гэта якраз тыя зьявы ў сучасным становішчы, за якія, кажучы словамі Леніна, трэба ўхапіцца, каб літаратурны рух давесьці да разьвіцьця беларускай пролетарскай літаратуры.

Цяпер аб маладнякізму.

Папрабуем адшукаць социолёгічны эквівалент данае зьявы. Я аглядаў становішча літаратурнага руху, галоўным чынам, за пэрыод апошніх год (1920—24 г.) у яго агульных праявах. У гэтыя годы на літаратурных загонах красаваліся дзьве плыні, што нарадзіліся яшчэ ў форме адраджанізму. З аднаго боку—гэта „Спадчына“, пра якую Я. Купала кажа:

Нашу яго ў жывой душы,
Як вечны сьветач-полымя,
Што сярод цемры і глушы
Мне сьвеціць між вандоламі.
Жыве з ім дум маіх сям‘я
І сьніць з ім сны нязводныя,
Завецца-ж спадчына мая
Ўсяго старонка родная.

Такі „вечны сьветач-полымя“ 18 году (а ў друку 1922 г.). Гэта ў той час, калі нараджаўся новы сьветач-полымя—соцыялістычная бацькаўшчына. Поруч з гэтым „Водгульле“ з новымі кавалямі і старымі ланцугамі, „Пад родным небам“ з яго „чыстым мастацтвам для мастацтва“, са скарбам „у марах-снох і ў тайных муках“. З другога боку „Песьні працы і змаганьня“ з іх верaю, што „загіне доля горкая і злая“.

...У тую пору, хвілю тую
Боганосную, сьвятую,
Што нясе ў сьвет дарагую
Сьветазарную свабоду...

Потым „Сокі Цаліны“. Поруч расквітаюць „Сямімільныя крокі“, „Мільён“. Нарэшце „Завіруха“ рэволюцыйная і бунтарская, „Босыя на вогнішчы“, „Чырвонакрылы вяшчун“. Усе гэтыя літаратурныя творы другога боку ў пэўнай меры адбілі першую пару рэволюцыі—пэрыод грамадзянскай вайны. Я не кажу ўжо пра „дробязь“, якая бунтарскі зьвінела на старонках газэты „Сав. Беларусь“.

Вось чым, галоўным чынам, была засеяна недалёкая мінулая пара літаратурнай нівы. А час у грамадзкім руху быў ужо ня той. Настаў пэрыод мірнага будаўніцтва (пэрыод перадышкі). Пачуцьці і думкі, духоўныя сілы дзейнай сілы грамадзкага руху, што ўступіла ў новую гістарычную паласу з яе асабістасьцямі пераходу да будаўніцтва, патрабавалі для сябе новай пашы, новых об‘ектаў мастацкай творчасьці, што організоўвалі-б волю ў бок новай мэтаімкнёнасьці. Тое, што было ўжо, не магло задаволіць, бо фактычна зьяўлялася толькі спадчынай, у лепшым разе, ад пары грамадзянскай вайны. Вось чаму „раніца зарыкала“. Вось чаму, з вёскі пашлі „у замызганы горад з бярозавым кіем“, каб тут „буяніць“ і ўпівацца „электрычным бляскам“. Вось чаму з аднаго боку, патрэбен быў „бярозавы кій“, а з другога—горад усьміхаўся на вясковыя загоны „сінімі, блакітнымі далямі“, усьміхаўся „сонцам чырвоным“, бо ўжо дыміліся фабрыкі і заводы і верылася, што там гатуецца і паша для пачуцьцяў, мысьлі і волі. Вось крыніца і прычына твораў з такога характару вобразамі об‘ектывізаванай сьвядомасьці. Гэта быў рык раніцы шукаючай. Гэта вобразы жаданьняў бядняцкага сялянства і рабочых—самім тварыць пашу для пачуцьцяў, самім тварыць мастацкую літаратуру. Але, як жаданьні і воля дзейных сіл грамадзкага руху імкнуліся да організаванасьці, да колектыўнай працы-творчасьці, так і гэтыя ранічныя шуканьні зьліліся ў колектыў: хлопцы сялянскія з хлопцамі рабочымі—і вырас „Маладняк“ там, дзе „заіскрыла сонца—вір агню“, дзе „буралом спаліла з гольлямі“. Чуеце, *буралом* спаліла бура. Дзе быў буралом, там „стройны лес“ і горды выглядам, нібы раць, што ймкнецца ў бой. Яго шум—што голас: „выедам пастаяць за праўду галавой“.

І вось з гэтага лесу-маладняка выпушчаецца „Комсамольская нота“—гэты вобраз, што здолеў у сябе зьмясьціць момант грамадзкага руху, які характарызуецца задачаю ўзмацаваньня сувязі гораду з вёскаю. Гэта яна крыкнула, што тут „у сонцы сэрца комсамоліць“ і што тут, у горадзе, хлопцы не парываюць думкі аб дабрабыце вёскі, і ў іх вачох тут адсьвечвае „васількавая журба“. Так, гэта журба не

па мінулым, а па тым, каб сягоньня... „ну, сонца стрымаць-бы ды ў вёску па дроту пусьціць“. Вось якая васількова журба. І поэта-маладняковец ажыцьцяўляе ў вобразе тое, што робяць хлопцы ў горадзе: „Вось таму і званю я ў кавадлы, каб сонца схваціць у ціскі“. Ці-ж гэты вобраз об'ектывізаванай клясавай сьвядомасьці не з'організуе пачуцьці, ці-ж ён не паддасьць сілы для будаўніка па вёсцы? А словы хлопца-рабочага: „Я буду сярод іх, я з імі на начлег паеду сіняй вясновай ноччу, „я—сын гораду, я—малады рабочы“. Так, здольны, бо вёска адклікаецца на „ноту“: „Усьміхаецца раніца сонцам чырвоным. Ніва калосьсямі маніцца засьпяваці, бо ўжо рунее поле ў зараве песьні ратая“.

Вось той грунт, на якім вырас „Маладняк“ і яго напрамак—маладнякізм, як процэс апанаваньня пролетарыятам і сялянствам зброяй клясавай барацьбы—мастацкай літаратурай. І нам тут трэба сьцьвердзіць, што на хвалях Кастрычнікавай рэволюцыі выплылі новыя мастацкія сілы з гушчы працоўных. Гэтыя новыя маладыя сілы, у процілегласьць панаваўшым сілам у беларускай літаратуры, паднялі новы сьцяг, папершае, сьцяг неадмаўленьня жыцьця, да якога дакаціліся некаторыя прадстаўнікі беларускай літаратуры ўжо у момант мірнага будаўніцтва, а сьцяг *станаўленьня* жыцьця, сьцяг барацьбы за соцыялізм і комунізм. Падругое, у васнову літаратурнай працы гэтыя новыя сілы палажылі прынцып колектывізму, а ў аснову творчасьці — жыцьцятворчасьць, жыцьцярадаснасьць і зблізканьне мастацтва з жыцьцём. Так узрастае „Маладняк“. Так, я-б сказаў, пачынаецца рэволюцыя ў беларускай літаратуры.

Якавы-ж адносіны да гэтай рэволюцыі як з боку працоўных мас, так і з боку прадстаўнікоў пануючай літаратуры і яе прыхільнікаў? З аднаго боку, бачым прыплыў у „Маладняк“ новых мастацкіх сіл з самых працоўных гушч, што сьведчыць аб правільным напрамку, узятым „Маладняком“. З другога—нападкі на „Маладняк“, і галоўны пункт гэтых нападкаў—гэта незразумеласьць маладнякоўскай творчасьці. Незразумеласьць—гэта тады, як масы самі папаўняюць рады „Маладняка“. Ствараецца цікавае становішча: маладнякоўскай творчасьці не разумеюць—і ў „Маладняк“ ідуць. Аб чым гэта кажа? Аб тым, што тут справа не ў „незразумеласьці“. Масы ня пойдуць туды, дзе ім незразумела, дзе няма пашы для пачуцьцяў, мысьлі і волі. Справа ўся ў ідэолёгічным грунце мастацка-творчай працы маладнякоўцаў, ад якога павеяла рэволюцыяй і на беларускіх загонах. Пад відам нападак на незразумеласьць уцішку праводзілася змаганьне з самой ідэолёгіяй, з пролетарска-сялянскаю сьвядомасьцю, якое праводзілася тымі, хто адчуў, як пачынае выбівацца з-пад іх ног глеба для ўплывовасьці на масы. Вось тут „Маладняк“ і ўзьнімаецца на варту проле-

тарска-сялянскай ідэолёгіі, узьнімаецца на барацьбу за ўплывовасьць гэтай ідэолёгіі на працоўныя масы. Напрамку мастацкай творчасьці з адраджэнцкай ідэолёгіяй, з яго ўхіламі ў бок разьвіцьця такіх форм, як сымболізм, романтызм і інш. у самамэтныя напрамкі, „Маладняк“ процівастаўляе напрамак творчасьці з пролетарска-сялянскаю ідэолёгіяй. Першы скарочана называецца адраджанізмам, а другі, як яго процілегласьць, яго зьмена—маладнякізмам.

Вось грунт, на якім вынік гэты новы напрамак. Ён зьяўляецца, як форма змаганьня за панаваньне пролетарска-сялянскай ідэолёгіі ў беларускай літаратуры. „Маладняк“ кінуў лёзунг, што ў беларускай літаратуры павінна жыць усё маладое, новае, здаровае, што ўзбагачае і павялічвае сілы працоўных мас, што організоўвае іх пачуцьці, мысьлі і волю ў бок будаваньня соцыялізму і комунізму. У гэтым аснова і сутнасьць маладнякізму. І працоўная моладзь пашла за „Маладняком“.

І тут нам трэба прызнаць, што адмаўленьне існаваньня маладнякізму—гэта адмаўленьне таго напрамку ў пролетарска-сялянскім руху, калі пролетарыят і сялянства ўзьнімаюцца самі дзеля таго, каб апанаваць мастацкай літаратурай, як зброяй клясавай барацьбы, як зброяй і адным з сродкаў соцыялістычнага будаўніцтва. Адмаўленьне існаваньня маладнякізму прыводзіць да адмаўленьня наогул формы і напрамку, праз якія пролетарыят апаноўвае мастацкай літаратурай на беларускіх загонах, прыводзіць да адмаўленьня формы і напрамку, зьвязаных непасрэдна з жыцьцём пануючых кляс. Гэта мы і павінны сёньня сказаць і намеціць далейшы шлях і лініі да разьвіцьця будучай беларускай пролетарскай літаратуры, як аднаго з зьвеньняў міжнароднай пролетарскай літаратуры.

Адносна пролетарскай культуры Ленін сказаў, што яна павінна зьявіцца ў выніку законамернага разьвіцьця тых запасаў вед, якія чалавецтва выпрацавала пад прыгнётам капіталістычнага грамадзтва, памешчыцкай грамады, у выніку апанаваньня гэтымі запасамі вед і пераапрацоўкі іх пролетарыятам. Тое самае трэба сказаць і адносна пролетарскай літаратуры, як адной з галін пролетарскай культуры. Ня будзем тут прадугадваць яе будучых форм і напрамкаў, толькі скажам, што і беларуская пролетарская літаратура зьявіцца ў выніку законамернага апанаваньня беларускім пролетарыятам і сялянствам тымі накапленьнямі, якія ёсьць ужо ў беларускай літаратуры, і ў выніку пераапрацоўкі гэтых дасягненьняў. Гэты процэс у разьвіцьці беларускай літаратуры ўжо распачаўся. Змаганьне за аўладаньне дасягненьнямі папярэдняй пары і за пераапрацоўку іх—гэта ўжо рэальны факт, якога адкінуць нельга. „Маладняк“—насіцель гэтага процэсу, напрамак якога мы і называем маладнякізмам. І трэ-

ба прызнаць, што гэты напрамак, гэта форма, якая характарызуецца ўбіраньнем у сябе ўсяго каштоўнага і прогрэсыйнага з папярэдняй літаратуры і яго пераапрацоўкаю, зьяўляецца адным з этапаў на шляху разьвіцьця беларускай пролетарскай літаратуры.

Намеціць шлях, вызначыць лініі на далейшы час у творчай працы „Маладняка“—гэта задача, якая стаіць сёньня перад намі.

Як бачыце, „Маладняк“ заняў месца рэволюцыянэра ў беларускай літаратуры і цяпер стаіць перад неабходнасьцю плянавай, сыстэматычнай працы па разьвіцьцю і стварэньню беларускай пролетарска-сялянскай літаратуры.

У якіх-жа адносінах „Маладняк“ знаходзіцца з іншымі літаратурнымі групоўкамі ці асобнымі прадстаўнікамі іншых напрамкаў? Тут становішча, як вядома ўсім, такое, што іншых груповак ці організацый беларускіх пісьменьнікаў няма. Ёсьць асобныя прадстаўнікі з рознымі ўхіламі ў творчасьці, але нязгуртованыя ў якое-небудзь аб'яднаньне, хаця некаторая агульнасьць між імі ёсьць. Вось процi гэтай агульнасьці, якая выражаецца ў творчасьці праз выяўленьне адраджэнцкай ідэолёгіі, „Маладняк“ заняў позыцыю няпрымірымай барацьбы. Але пастолькі, паколькі асобныя прадстаўнікі беларускай літаратуры выяўляюць нахіл да перабарэньня гэтага налёту агульнасьці, да перабарэньня адраджэнцкай ідэолёгіі і ўспрыняцьця ідэолёгіі пролетарска-сялянскай, „Маладняк“ не адзін раз выяўляў жаданьне супольнай з імі працы, супрацоўніцтва з імі.

З літаратурнымі групоўкамі, што пішуць на не беларускай мове, але ў аснове сваёй маюць пролетарскую ідэолёгію, „Маладняк“ стварае адзіны фронт, убіраючы іх у свае рады.

Намячаючы на далейшы час лінію „Маладняка“ ў адносінах да іншых прадстаўнікоў літаратуры, мы тут павінны цьвёрда сказаць, што яна павінна быць лініяй непрымірымай барацьбы з насіцелямі буржуазнай або мяшчанскай ідэолёгіі і лініяй супрацоўніцтва з тымі, хто выяўляе жаданьне да ўспрыняцьця ідэолёгіі пролетарска-сялянскай.

Я ўжо зазначаў рост „Маладняка“ за лік рабоча-сялянскай моладзі. І мы павінны сёньня конкрэтна сказаць, што „Маладняк“ яднае ўсе літаратурныя сілы пролетарскай і сялянскай масы на адзінай ідэолёгічнай аснове і стаіць пад знакам далейшага ўзросту. Карыстаньне ў творчасьці тымі ці іншымі мастацкімі формамі ці прыёмамі не зьяўляецца для „Маладняка“ перашкодай для яго ўзросту. Мы павінны аўладаць усімі мастацкімі формамі і прыёмамі, іх пераапрацаваць у інтарэсах Кастрычнікавай рэволюцыі.

Трэба, таксама, сьцьвердзіць, што „Маладняк“ абапіраецца на масавы рух пролетарска-сялянскай моладзі, якая

імкнецца аўладаць беларускай мастацкай літаратурай, як зброяй клясавай барацьбы.

Такое становішча высоўвае перад намі задачу—наметаць лінію ў далейшым узросьце „Маладняка“. Трэба падкрэсьліць неабходнасьць у далейшым асобую увагу зьвярнуць на якасны ўзрост „Маладняка“ і яго творчасьці.

З усяго зазначанага, з самога характару працы „Маладняка“, якая не абмяжоўваецца літаратурным габінэтам, а разгортваецца сярод шырокіх кол грамадзтва, сярод рабочых і сялян, якая носіць у сабе зародак сапраўднага збліжэньня мастацтва з жыцьцём, якая накіравана на выяўленьне мастацкіх сіл у самых працоўных гушчах,—усё гэта як ня трэба лепей, характарызуе і мэту „Маладняка“. І мы павінны сёньня цьвёрда сказаць, што „Маладняк“ мае адну мэту—гэта служыць справе рэволюцыі, справе перамогі пролетарыяту і сялянства, змагацца з усімі ворагамі рэволюцыі і будаваць соцыялістычны лад жыцьця.

Канчаючы свой даклад, я дазволю сабе зрабіць некаторыя вывады адносна сучаснага становішча беларускай літаратуры.

Сучаснае становішча беларускага літаратурнага руху характарызуецца наліччам дзьвёх асноўных сіл. Першыя—прадстаўнікі напрамку адраджанізму, якія стаяць на раздарожжы перад будучынаю і фактычна толькі твораць завяршэньне слаўнай эпохі ў гісторыі беларускай літаратуры. Другая сіла—сіла колектыўная ў постаці „Маладняка“. Яна зьяўляецца састаўной часткай асноўных дзейных сіл рэволюцыі ў грамадзянскім руху на беларускіх загонах. Гэтая новая сіла, творачы перадом у літаратурным руху, мае мэтаімкнёнасьць да стварэньня беларускай пролетарскай літаратуры. Напрамак „маладнякізм“—гэта этап у процэсе пролетарска-сялянскага аўладаньня мастацкай літаратурай, як зброяй клясавай барацьбы, гэта форма, у якой об‘ектывізуецца клясавая сьвядомасьць пролетарыяту і сялянства. Рэшта сіл мастацкіх займаюць прамежнае становішча з вялікаю цягаю да другой рашаючай сілы.

Уся жыцьцёвасьць концэнтруецца вакол „Маладняка“ і ў „Маладняку“. Гэта тое зьвяно, якое вядзе да беларускай пролетарскай літаратуры.

Заҁунела, зарунела аксамітам...
Рэчкай срэбнай—сонцам залілося...
На палёх здратованых, прыбітых,
Паглядзі!.. Вясну радзіла восень!..
Маладняк зялёны, бач, кудравіць,
Ахіляе край іскравым лісьцем...

*(Чарот).*

Чарот. Слова аб „Маладняку“ даецца ганароваму сябру прэзыдыуму т. Ул. М. Ігнатоўскаму. (Пленум гарачымі воплескамі сустракае т. Ігнатоўскага).

Ігнатоўскі. „Вясну радзіла восень“—пачну словамі маладнякоўца М. Чарота. Так. „Маладняк“ народжаны Вялікім Кастрычнікам. Кастрычнік—гэта эпоха дыктатуры пролетарыяту, эпоха будаваньня горадам і вёскаю новага укладу жыцьця.

„Маладняк“—дзіцё гэтае эпохі.

Сутнасьць „Маладняка“—гэта удзел яго ў агульнай справе Вялікага Кастрычніка.

Старая беларуская літаратура прызнала Вялікі Кастрычнік, але толькі прызнала. „Маладняк“-жа ня толькі прызнаў яго, але і прыняў шчыры і непасрэдны удзел у змаганьні за яго на Беларусі.

Вось чаму кожны маладняковец павінен у нашых цяперашніх буднях адшукаць праявы новага жыцьця, створанага Вялікім Кастрычнікам, і адбіць іх з дапамогаю слова мастацкай літаратуры. Гэта справа вельмі вялікая і вымагае шмат энэргіі, цярплівасьці і здольнасьці.

Дарэволюцыйны культурна-грамадзкі і літаратурны кірунак на Беларусі—адраджанізм яшчэ не завяршае апошняга кола свайго разьвіцьця. Адраджанізм ня можа зьнікнуць зусім. Ён пераменіцца, выльлецца ў разуменьне нацыянальнага пытаньня Компартыяй.

Адраджэньне, як частка цэлага гэтага паняцьця, будзе, бязумоўна, пакуль што і ў маладнякізьме. Нам яшчэ прыходзіцца ня мала змагацца за поўнае нацыянальнае вызваленьне Беларусі і яе культурна-экономічнага адраджэньня.

Мотывы гэтага змаганьня і адраджэньня ў нашым разуменьні гэтага слова, бязумоўна, яшчэ будуць у маладнякізьме. Але паступова, поруч з усё шырэйшымі заваёвамі Вялікага Кастрычніка, элемэнты гэтыя будуць выціскацца мотывамі інтэрнацыяналізму.

Наша эпоха павінна даць сваіх ідэолёгаў—сыноў свайго часу, якія ня будуць прасякнуты індывідуалізмам, неўласьцівым пролетарыяту.

Піша не асобны пясьняр, піша эпоха. Наша эпоха—эпоха дыктатуры пролетарыяту, якая характарызуецца злучнасьцю рабочага з селянінам для пабудовы новага жыцьця. Маладнякоўцы апісваюць і будуць апісваць якраз селяніна і рабочага нашага часу—часу дыктатуры пролетарыяту.

Сапраўдных пролетарскіх пісьменьнікаў пакуль што ў нас няма—ёсьць пісьменьнікі эпохі дыктатуры пролетарыяту.

Будучыня ў беларускай літаратуры за „Маладняком“. „Маладняк“ павінен заўсёды помніць аб самым галоўным, чаго вымагае наш час,—гэта не парушыць сувязі гораду з вёскаю. Якраз гэтым апошнім павінны кіравацца маладнякоўцы

ў сваёй ідэолёгічнай пляцформе. Форму твораў „Маладняк“ павінен адшукаць такую, якую зразумее кожны селянін, кожны рабочы. Але гэта яшчэ ня значыць, што маладнякоўцы павінны адкідаць запатрабаваньні ўсякай мастацкай літаратуры, як гэткай, і цалкам падрабляцца пад вёску. Вёску трэба цягнуць за сабою, вёску трэба заваяваць. У наш час аб селяніне прыдзецца шмат пісаць,—куды больш, чым аб рабочым. Зразумела, нам прыдзецца і стыль такі знайсьці, каб ён адпавядаў зразуменьню селяніна.

Прымаць непасрэдны удзел у будаваньні Кастрычніка —вось заданьне „Маладняка“.

Чарот. Таварышы, у зьвязку з тым, што хутка, праз поўгадзіны, у Беларускім Дзяржаўным Акадэмічным тэатры пачнецца наш вечар, я лічу, што спрэчак па дакладу т. Бабарэкі цяпер ня варта нам распачынаць. Лепш усяго перанесьці іх назаўтра. (Прапанова тав. Чарота прымаецца).

Згодна нашаму рэгляманту, чарговае пасяджэньне пленуму ЦБ пачнецца заўтра а 10 гадз. раніцы.

* * *

Програма вечару „Маладняка“ і Б. Д. А. Т. наступная:

1. “На Купальле“ — музычная драма маладнякоўца М. Чарота.

2. Чытка навейшых маладняцкіх твораў самімі аўтарамі і артыстымі Б. Д. А. Т.

3. „Што чуваць?“—сатырычная газэта „Маладняка“.

Музычная драма „На купальле“, ня гледзячы на тое, што яна вытрымала ўжо шмат пастановак, глядзелася публікаю з вялікім захапленьнем.

У чытцы твораў выступалі прадстаўнікі амаль усіх філій „Маладняка“ і артыстых тэатру.

Уражаньне ад маладнякоўскіх твораў, якія адбіваюць наша сучаснае, жыцьцёвае, засталося ў публікі добрае.

Газэта „Што чуваць“ у агульным прашла жвава. Мясьцінамі адчуваліся шурпатасьці, што тлумачыцца сьпешнасьцю падрыхтоўкі матар‘ялу. Асабліва зацікавіў публіку чытаньнем сваіх вершаў у газэце вядомы сатырык-маладняковец Крапіва.

---

*Ранешняе пасяджэньне пленуму 22 сакавіка.*

Чарот. Першае слова ў спрэчках па дакладу А. Бабарэкі, згодна запісу, мае Язэп Пушча (Плашчынскі).

Пушча. З аснаўным, што говарылася ў дакладзе, згаджаюся. Аб сучасным моманце беларускай літаратуры буду спрачацца. Ц. Гартны, Цётка, А. Гурло—ня ўсе з іх зьяўляюцца поэтамі-рабочымі. Ц. Гартны, праўда, падходзіць блізка, ну, а Алесь Гурло, напрыклад, да рэволюцыі быў сялянскім песьняром, зараз застаўся такім, як ён сам зазначае ў сваіх творах.

імя В. І. Леніна

Далей: мэта „Маладняка“ служыць справе рэволюцыі. Гэта мэта, асродак які? Бязумоўна, слова. Але поэта павінен гэтыя словы скомпанаваць так, каб сяляне і рабочыя іх зразумелі, а разам з тым зразумелі і тое, што „Маладняк“ прышоў ажыцьцёвіць у сваёй творчасьці ідэі Кастрычніка. Вось тут і трэба паглядзець: як павінны мы разумець форму? Форма—адзнака соцыолёгічная. У старых формах апець новую эпоху нельга. Новая кляса прынесла з сабою ўсё новае. Нельга-ж браць зьмест новы, а форму старую. Форма й зьмест непадзельны. Аднэй з галоўных адзнак нашай формы павінен быць вобраз, бо ён глыбока захован у нашых народных песьнях. Нам, каб даваць для масы вобразныя, зразумелыя творы, трэба браць гэтыя вобразы з народных песень і стылізаваць іх адпаведна новаму зьместу.

Трэба нам даваць у сваіх творах стылізацыю народнай песьні.

Чарот. Чарговае слова ў парадку запісу мае Ўл. Дубоўка.

Дубоўка. Я асабіста не згаджаюся з тэрмінолёгіяй: адраджанізм і маладнякізм. Тэрмін „маладнякізм“ ня можа абагульніць маладняцкіх твораў, як літаратурная школа, якой мы не ўтвараем.

Форму й зьмест мы можам падзяліць вось якім парадкам. Калі форма будзе й добрая, а ідэолёгія ня наша, то форму можна скарыстаць, адкінуўшы ідэолёгію. Твор павінен мець добра апрацаваную форму, бо калі ён будзе мець адзін зьмест—будзе не мастацкім.

У нас пакуль што няма адзінай формы і напрамку.

Кожны з нас карыстае тыя ці іншыя элемэнты старых напрамкаў, выбіраючы з іх усё карыснае і прыгоднае. А паколькі гэта так, пастолькі нельга гаварыць аб пэўных напрамках і плынях. Мы зараз вядзём студыйную працу, вучымся. У процэсе нашай гэтай працы мы павінны адшукаць такую форму, якая-б была зразумелай для мас. У сваёй творчасьці мы павінны выходзіць з запатрабаваньня мас. „Маладняк“ у гэтым напрамку ўжо зрабіў першыя крокі. Тав. Ажгірэй даў агіткі. Яны ў наш час дарагі тым, што іх патрабуе маса, яны робяць жывую справу.

Аб старых. Старыя пісьменьнікі, праўда, ня могуць даць новага, нашага сягонешняга. Але-ж „Маладняк“ цалкам не замяніў старых. „Маладняк“ замяніў іх толькі ідэолёгічна. Гэтага мала. Наша задача працаваць над сабою, працаваць, каб запраўды замяніць старую літаратуру новаю.

Трэба даваць ня толькі ідэолёгію, але й творы. Мы павінны задумацца над стварэньнем шырокай літаратуры. Мы павінны даць драму, кіно і г. д.

Ігнатоўскі. Дазвольце, таварышы, на хвіліну перапыніць спрэчкі. Да вас, на маладняцкі пленум, прышоў ста-

ры народнік-рэволюцыянэр Бонч-Асмалоўскі. Я думаю, што не памылюся, калі ад імя ўсяго пленуму прывітаю нашага старэйшага рэволюцыянэра—Бонч-Асмалоўскага.

Бонч-Асмалоўскі. Вы, маладое пакаленьне, жывіцё ў зусім другіх умовах, чым жылі мы. Вы працуеце вольна, творыце сваю культуру, свой дабрабыт. Ня так жылі мы. Не аб гэтым прыходзілася нам думаць.

Мы біліся ўвесь час над тым, як-бы выбіцца з цiскоў царызму. І наша праца дарма не прапала... Я вельмі рад, што дажыў і магу бачыць сваімі вачамі тое, аб чым марыў і за што змагаўся. Я выражаю прыемнасьць сваёй прысутнасьці сярод моладзі, якая цягне далей пачатую намі справу...

Чарот. Чарговае слова па дакладу даецца тав. Зарэцкаму (Касянькову).

Зарэцкі. Пролетарыят не адкідае цалкам усяго старога. Ён глядзіць на рэчы з чыста практычнага пункту погляду. Пролетарыят карыстае ўсё каштоўнае ад старой формы. Для новай ідэолёгіі не абавязкова адшукваць абсолютна новай формы, дагэтуль не адшуканай. Тав. Ігнатоўскі сказаў: „Маладняк“ увашоў у будні. Я-б сказаў, што тав. Ігнатоўскі перабаршчыў. „Маладняк“ тут мала даў. Ён аддаў увагу шуканьням формы, а зьмест стаіць на адным месцы. „Маладняк“ не адышоў ад сьвяточных уздымаў. Аднастайнасьць зьместу і многастайнасьць формы. Гэта наша кволае месца; форма новая трэба, але яе ўтворыць час.

Чарот. Мне здаецца, што тав. Ігнатоўскі ў сваім учарашнім слове сказаў: „Тую пляцформу, якой карыстаецца Маладняк, трэба зьмяніць“. Я выклікаю тав. Ігнатоўскага зараз на слова. Хай ён нам скажа яшчэ аб гэтым.

Ігнатоўскі. Форма, а не пляцформа. Тав. Чарот мабыць ня ўчуў. (Усе згаджаюцца з Ігнатоўскім).

Бязумоўна, да некаторага стопня адчуваецца, што форма некаторых маладнякоўцаў надумана. Новага жыцьця, праўда, нельга адбіць у старых формах, а гэта новае, кастрычнікавае мы знаходзім у ва ўсім цяперашнім жыцьці, у нашых буднях.

Што такое „Маладняк“? Ці гэта літаратурная плынь, ці якая іншая?

Я думаю, што хутчэй социяльная, чым літаратурная. Але сягоньня гаварыць аб гэтым пэўна нельга. Таксама нельга і цяжка зараз філёзофскі абаснаваць форму, як вобраз.

Дуалізм ці монізм? Гэта можа быць пакуль што толькі пытаньнем. Але памойму: зьмест—адно, а форма—другое. Яны толькі зьліты, пераплецены паміж сабою. Мы павінны імкнуцца да монізму. Калі аддзяляць вобраз ад зьместу—унесьці дуалізм—атрымаем скандал мастацкі, па поглядах песьняра. Для чытача-ж аналіціка зьмест будзе адно, а форма другое.

Можа з часам „Маладняк“ і выльлецца ў літаратурную плынь з пэўнаю літаратурнаю школаю, але сягоньня для „Маладняка“ гэтага мала, бо, як я ўжо вышэй сказаў, ён сягоньня—хутчэй плынь социяльна-культурная.

Чарот. У парадку запісу слова атрымае т. Шукайла.

Шукайла. „Маладняк“ ідзе шляхам ленінізму. Формальна-мастацкі бок маладняцкай творчасьці выклікае ў нас вялікія спрэчкі. Старая форма ня можа быць ужыта цяпер. Форма павінна адказваць зьместу.

Чарот. Чарговае слова—тав. Александровічу.

Александровіч. У нас узьняліся тут вялікія спрэчкі аб маладнякізьме, як аб формальным напрамку. Нам, мне здаецца, ня цікава формальнасьць. Куды лепш будзе, калі ў „Маладняку“ зьявіцца некалькі здаровых, социяльна вытрыманых напрамкаў.

Аб форме. Мы яшчэ маладыя. Мы яшчэ не адшукалі новай сваёй формы, якая-б адпавядала нашай ідэолёгіі і была зразумелай для мас. Мы будзем шукаць гэтае формы і адначасна прыстасоўваць яе да жыцьця, правяраючы на масах. Цяпер нам трэба даваць свае творы ў зразумелай форме, каб гэтым павесьці за сабою масы.

Чарот. Чарговае слова мае тав. Аляхновіч.

Аляхновіч. Форма і зьмест павінны мець адну сугучнасьць паміж сабою, а адначасна быць зразумелымі для мас.

Чарот. Слова мае тав. Паскрэбка.

Паскрэбка. Згаджаюся з т. т. Пушчаю і Шукайлай. Не згаджаюся толькі з Александровічам у тым, што цяпер нам абавязкова патрэбна пісаць толькі частушкі ці нешта да іх падобнае. Аб форме пытаньне яшчэ ня можа быць вырашана цяпер.

Чарот. Слова мае тав. Крапіва.

Крапіва. Я буду казаць, як чытач-селянін. Маладняк—сын рабоча-сялянскай клясы і павінен пісаць для гэтае клясы. Мова, формы і вобразы маладняцкай поэзіі павінны быць зразумелымі масам.

Чарот. Слова чарговае даецца тав. Радкоўчыку.

Радкоўчык. Новых твораў вёска яшчэ ня зусім разумее. Вёска хутчэй чытае старых пісьменьнікаў, як Ф. Багушэвіча, Коласа, Купалу. Чаму?—Аб гэтым сказаць нічога не магу.

Чарот. Слова—Я. Пушчы.

Пушча. Пытаньне аб зразумеласьці і незразумеласьці найноўшых твораў зьяўляецца агульна-саюзным пытаньнем. Тут справа псыхолёгічн. характару. Аб гэтым я зазначаў раней.

Тав. Ігнатоўскі ў сваім слове зазначыў, што мы ўва ўсім цяпер бачым новую форму. Твор таксама не павінен адставаць ад жыцьця.

Падзел зьместу і формы яшчэ ня вырашаны. За монізм згаджаецца марксыцкая крытыка.

Маладнякізм ужо насьпеў. Нам няма чаго баяцца гэтага тэрміну, які абхапляе нашае сягонешняе маладое ў літаратуры. Само жыцьцё высоўвае гэты тэрмін.

Ч а р о т. Наступнае слова тав. Зарэцкаму.

З а р э ц к і. Я ня лічу патрэбным ашчарэпіцца і трымацца старых форм. З іх трэба выкарыстоўваць самыя лепшыя для нас элемэнты.

Тав. Пушча ў сваім слове зазначыў, што сяляне ідэолёгічна не перарадзіліся. Значыць, нельга браць формы (вобразаў) селяніна, які ідэолёгічна ня вытрыманы. У слове т. Пушчы ёсьць супярэчнасьці.

Ч а р о т. Слова даецца дзядзьку Дыле.

Д ы л а. З аналізу літаратуры вядома, што форма мае сувязь са зьместам. Форма дапамагае нам адзначыць надворны бок об'екту.

Шуканьне новай формы—рэч цяжкая. Але маладнякоўскія творы ўжо маюць нейкія адзнакі па форме ад старых твораў, і гэтае дае нам спадзею, што гэтая новая форма будзе адшукана.

Ч а р о т. Слова мае т. Чарнушэвіч.

Ч а р н у ш э в і ч. Літаратура кожнай эпохі мае свой асабісты, характэрны гэтай эпосе стыль. Пролетарыят павінен таксама ўтварыць свой стыль—напрамак. Гэты напрамак т. Бабарэка называе маладнякізмам.

Ч а р о т. Слова прадапошняе даецца т. Дубоўку.

Д у б о ў к а. Папярэдні прамоўца, т. Чарнушэвіч, сказаў, што мы павінны ўтварыць свой напрамак. Мы ня формай заваёўваем месца ў беларускай літаратуры. Формамі мы карыстаемся старымі, дадаючы і шукаючы новае. Мы, самае галоўнае, вызначылі сабе ідэолёгію. Усё прыгоднае для нас мы стараемся выкарыстаць з іншых формальных напрамкаў і тварыць на іх новае сваё. Мы павінны больш усяго даваць зразумелыя творы. Напрамкі прыдуць самі.

Ч а р о т. Заключнае слова мае т. Бабарэка.

Б а б а р э к а. Выступаючыя прызналі, што мы творым новае. Але ацаніць гэта новае хацелі старым аршынам. Калі мы творым новае, трэба мець новую мерку. Калі „Маладняк“ вызначыў, што ён праводзіць у жыцьцё ідэі матар'ялізму, то тут ужо быў намечан пэўны характар творчасьці.

Што такое матар'ялізм?

Гэта прынцып—ісходзіць з першапачатковай прычыны—матэрыі. Гэта мы павінны прыняць у васнову мастацкай творчасьці. Мастацкі твор з аднаго боку—форма, з другога—зьмест. У процэсе творчасьці запас вед матар'ялізуецца. Твор зьяўляецца формай. Поэта карыстаецца ўсімі прыёмамі літаратуры, з іх дапамогай матар'ялізуе сваю ідэолёгію.

Мастацкі твор—об'ект, які выклікае пэўныя адчуваньні, становіцца зьместам нашае думкі. Што было, такім чынам,

формаю, зараз становіцца зьместам. Функцыянальнасьць мастацкіх твораў—вось што чуваць тут.

Трэба раз назаўсёды адкінуць выхады з формы і зьместу, іх трэба зьліць. Падзел твораў на зьмест і форму—водгук дуалістычнага сьветапагляду. На аснове матар'ялістычнай тэорыі мы прыходзім да монізму (зьлітнасьці формы й зьместу).

Мастацкі твор—адзінка літаратуры. Уся літаратура—форма выяўленьня сьветапагляду клясы.

Аб напрамках. Возьмем романтызм, рэалізм, і інш. „ізмы", ці выявіла сутнасьць іх марксыцкая крытыка?—Не!

Што такое маладнякізм?

Гэта зьява, высунутая жыцьцём. Гэта форма, якая выяўляе пэўны стан сьвядомасьці пролетарскае клясы. Тэрмін можа і ня зусім удалы.

Гаварылі, што літаратурнага напрамку маладнякізму ня будзе. А як назваць працэ субіраньня карыснага ад форм старых школ, перааапрацоўку яго, рух да апанаваньня літаратурай пролетарыятам, які йдзе з нізоў? Мы назвалі сябе не пролетарскай літаратурай, а „Маладняком". Мы сказалі, што трэба апанаваць усімі мастацкімі прыёмамі, каб у іх зьмясьціць сваю клясавую мэтаімкнёнасьць. Працэс заваяваньня мастацкіх позыцый мы і называем маладнякізмам.

Нам важна ўстанавіць той прынцып, цераз які мы павінны об'ектывіраваць нашыя пачуцьці. Яго трэба ўзяць у рэволюцыі. Высокія жанры зьмяніць нізкімі.

Мы ідэолёгічна вызначылі пэўнае месца ў беларускай літаратуры. Перад намі цяпер задача—працаваць над уменьнем карыстацца літаратурнымі прыёмамі для служэньня рэволюцыі.

Аб ухілах. Ці шкодны яны?—Не. Мы зьяўляемся колектывам. Калі ўхілы будуць хворымі, мы іх будзем выжываць...

Мы занялі няпрымірную позыцыю да тых, у каго ідэолёгія ня наша. Хто-ж хоча перарадзіцца, мы з тымі павінны лічыцца.

Аб незразумеласьці масамі нашых твораў. Адна крыніца для гэтага:—барацьба з маладняцкай ідэолёгіяй. Нас абвіняюць у большасьці людзі асьвечаныя. Другая крыніца—калі мы чуем голас мас, мы павінны прыслухоўвацца да гэтага.

### Справаздача ЦБ „Маладняка".

Ч а р о т. Цяпер рэзолюцыі прымаць па першаму дакладу, я думаю, ня будзем, а заслухаем наступны даклад.

Т. Ш у к а й л а. Дазвольце ўнесьці прапанову.

Ч а р о т. Калі ласка.

Ш у к а й л а. Для апрацоўкі рэзолюцый па першаму дакладу і справаздачы ЦБ я прапаную абраць дзьве комі-

сіі,—організацыйную і выхаваўчую, якія будуць апрацоўваць таксама і плян далейшай працы.

Чарот. Стаўлю прапанову на галасаваньне. (Прымаецца).

Чарот. Сьпіс сяброў у адпаведныя комісіі я прапаную даручыць склясьці прэзыдыуму. (Прымаецца).

Чарот. Па другому пытаньню „Справаздача ЦБ „Маладняка“ даецца слова А. Вольнаму.

Вольны. Год таму назад зарадзілася нашае аб'яднаньне з 7 чалавек, якія паставілі сабе мэтаю перарадзіць беларускую літаратуру. „Маладняк“ пачаў яе перараджаць, „Маладняк“ сваім юнацкім запалам акомсамоліў і амаладнячыў і тых старых пісьменьнікаў, якія ўвашлі ў „Маладняк“.

Працаваць нам спачатку было вельмі цяжка. Мы спаткаліся са старою літаратураю і пачаліся спрэчкі паміж „Маладняком“ і старымі пісьменьнікамі за ўплывы і г. д.

Рэволюцыя выбіла глебу з-пад ног старых пісьменьнікаў. Яны путаюцца ў сваіх творах, ня маюць конкрэтнасьці думкі і заданьняў Кастрычніка. Некаторыя з іх, адарваўшыся ад новай плыні грамадзкага жыцьця, проста зьдзяцінелі, напр., Грамыка, які пяе аб жабцы, што ён спужае яе незнарок і г. д.

Старая беларуская культура вельмі акадэмічная. Інбелкульт утварае культуру акадэмічным шляхам. „Маладняк“ гэткім мэтодам не карыстаецца. „Маладняк“ практычным шляхам праводзіць у жыцьцё новую маладняцкую культуру.

Старая і новая культуры спаткаліся ня вельмі дужа спагадна адна да другой. Старая культура старалася падарваць маладняцкія ўсходы. Мы не маглі друкавацца. Дзяржаўнае Выдавецтва прынцыпова не згаджалася прымаць да друку нашых твораў. Нашым маладнякоўцам прыходзілася выпускаць зборнічкі сваіх твораў за свае ўласныя грошы. Напр., так быў выдадзены зборнічак вершаў „Комсамольская нота“. І толькі, як гэты зборнічак хутка разышоўся, ДВБ зьвярнула нам грошы.

Старая наша крытыка была самай нявытрыманай у адносінах да „Маладняка“. Аб гэтым сьведчыць хоць-бы апошні ўздым—той факт, што паважаны гісторык беларускае літаратуры ні слова не ўпамінае ў сваёй літаратуры аб поэце-маладнякоўцу А. Гурло. Алесь Гурло мае ўжо 15 год літаратурнай працы за плячамі.

Далей. На „Маладняк“ чужаземцы глядзелі са званіцы некаторых старых пісьменьнікаў, якія бяз ведама „Маладняком“ давалі інформацыі за межы аб „Маладняку“. Напр., інформацыі паважанага беларускага поэты З. Бядулі, да украінскіх пісьменьнікаў. Падобных фактаў шмат. Усіх іх няма ніякае магчымасьці пералічыць.

Усе гэтыя бойкоты і напады на „Маладняк“ рознымі шляхамі збоку прадстаўнікоў старой беларускай культуры

прымусілі „Маладняк“ пачаць бой „з гарматы па вераб‘ёх“ і інш.

Матар‘яльныя магчымасьці нашай арганізацыі былі зусім сумнымі.

Аснова нашай працы да ўтварэньня філій была ў Менску. Менская філія ўзяла на сябе ініцыятыву да арганізацыі філій ува ўсіх акругах. Гэта было выканана таксама Менскай філіяй.

Цяпер у нас маецца 7 філій, шэраг студый, сэкцый розных галін мастацтва і іншых культурных арганізацый.

Выхаваўчая праца вялася, галоўным чынам, у Менскай філіі.

Выезды для інструктаваньня кіраўніцтва філіямі ЦБ рабіліся больш-менш частыя.

Цяпер „Маладняк“ ужо перарос сябе, як літаратурная арганізацыя. „Маладняк“ сягоньня—гэта маладая арганізацыя, аб‘яднаючая новую беларускую культуру.

Рэзкую лінію ў адносінах да старых культурных дзеячоў нам трэба яшчэ весьці.

Чарот. Я думаю нам патрэбна заслухаць яшчэ справаздачы філій, тады адчыняць спрэчкі па справаздачы ЦБ. (Прапанова прымаецца).

Па справаздачы ад Полацкай філіі слова даецца таварышу А. Дудару.

Дудар. Зусім іншыя існуюць умовы ў Полацку і Віцебску для арганізацыі філій.

Полацкая філія „Маладняка“ арганізавалася толькі два тыдні таму назад. Філія ў горадзе Полацку налічвае 8 сяброў. Апрача гэтых, маецца яшчэ 5 чалавек у раённых філіях.

Праца Полацкай філіі толькі-што разгортваецца. За 2 тыдні праведзена 3 сходы і некалькі вечароў аб беларускай культуры.

Праўленьне філіі цяпер унесла ў плян працы філіі шэраг выездаў у раёны. Але для гэтае справы няма ў філіі ніякіх сродкаў.

Чарот. Чарговая справаздача будзе Менскай філіі. Слова для справаздачы даецца старшыні філіі тав. Александровічу.

Александровіч. Менская арганізацыя прарабіла рэарганізацыю. Спачатку залажылася, як група „Маладняк“, потым, як Усебеларускае аб‘яднаньне, і напасьледак, як філія гэтага аб‘яднаньня.

Арганізаваліся мы 28 лістапада 1923 г. Спачатку заміж усялякай унутраной працы адбывалася барацьба за існаваньне арганізацыі.

Пляну працы ў пачатку ніякага ня было. Рабіліся вечары, хлопцы чыталі свае творы, імкнуліся разьвіваць самакрытыку.

Мы паступова расьлі. Сталі выяжджаць ладзіць вечары ў Чэрвень, Барысаў, Віцебск, Магілёў, Полацак і інш.

Пасьля рэорганізацыі праведзена 15 вечароў. Зроблена тры (3) даклады аб маладнякоўцах, тры (3) аб маладнякізьме. На сходах у нас і да апошняга часу даволі цяжка выклікаецца актыўнасьць.

Адна з баявых задач бліжэйшага часу—гэта выдавецкая справа. Пакуль што мы з дапамогаю комсамолу змаглі выдаць „Па беларускім бруку“, „Беларусь бунтарская“, „Два“.

Хлопцы, выяжджаючы на паветы, у Калініншчыне надрукавалі зборнічак.

Чарот. Далей ідзе Магілеўская. Слова кіраўніку філіі—Паскрэбку.

Паскрэбка. Глеба для працы цяжкая. Праз газэту агітавалі аб „Маладняку“ наколькі маглі. 15 лютага 1925 г. адбыўся першы організацыйны вечар. Ёсьць надзея, што філія будзе расьці. Пачынаем наладжваць сувязь з заводамі Атрымалі адпаведныя запрашэньні ад рабочых.

Чарот. І далей: справаздача Барысаўскае філіі. Слова—Аляхновічу.

Аляхновіч. Філія маладая. Яшчэ ня вышла з організацыйнае стадыі. Разасланы статут і анкеты. Праца вядзецца ў ячэйцы Наркомпроса.

Чарот. Справаздача Бабруйскае філіі — слова тав. Ляшэвічу.

Ляшэвіч. Філія ў організацыйным пэрыодзе. Якія ёсьць магчымасьці на далей? Ёсьць пэдагогічны і сельска-гаспадарчы тэхнікумы. Нядаўна агалошаны літаратурны конкурс даў 9 апавяданьняў, з іх 7 пабеларуску. Няма беларускае літаратуры. Наладжана сувязь з некаторымі заводамі.

Чарот. І нарэшце, справаздача Маскоўскае філіі. Слова, разумеецца, маю я.

Організавана філія ў мінулым годзе. У гэтым годзе працаваць пачала ўжо стала. Маецца каля 30 асоб. Усе вучацца. Друкаваліся. Больш усяго зварочваем увагу на самаадукацыю. Наладжваем вечары беларускай культуры ў клюбах, на заводах. Маем студыю з 40 асоб. Вядзем працу сярод беларускага студэнцтва.

Неабходна будзе наладзіць цясьней сувязь між філіямі.

Дубоўка. У Маскве 1500, беларускага студэнцтва. Сярод іх наша галоўная праца. Ёсьць тэатральная студыя, якая ў хуткім часе едзе ў Парыж на выстаўку з опэрай аднаго маладнякоўца Менскай філіі. Сіламі філіі выдаюцца дзьве насьценныя газэты ў унівэрсытэце народаў Захаду...

Чарот. Таварышы, хто хоча, можа, выказацца па справаздачы ЦБ „Маладняка“?

Пакуль няма нікога, бяру слова для сябе.

ЦБ, было абрана толькі з сяброў Менскае філіі. Праца яго малая. Маскоўская філія атрымала статут і анкету. Хлопцы спаткалі сур'ёзна, пакрытыкавалі і, паправіўшы ў некаторых мясцох, паслалі назад. Праўда, адказу чакаць доўга ня прышлося. Але цікавая штука, калі мы на паперах „Маладняка“ заўважылі штамп ІБК,—якім гэта парадкам гэта ўсё атрымалася?

Вольны. Тут справы матар'яльнага складу.

Чарот. Хто хоча выказацца па справаздачы ЦБ?

Дубоўка. Дайце мне па справе з Інбелкультам?

Чарот. Калі ласка.

Дубоўка. Дзякуючы матар'яльным умовам жыцьця, беларуская культура разьвівалася ня зусім нормальна. Але для свайго часу яна зрабіла многае. Мы зазначаем дасягненьні старэйшых культурных працаўнікоў.

Калі-ж прышоў Кастрычнік, усе маладыя сілы ў „Маладняку“, а старыя—у Інбелкульце .Мы маладыя, мы вучымся. Чаму ніхто з Інбелкульту не патурбаваўся прыйсьці да нас, каб даць нам тую ці іншую раду, на падставе свайго вопыту? Чым гэта тлумачыцца?

Чарот. Таварышы, наш пленум бойкотованы старымі. Сярод нас многа такіх, якія ў будучым будуць грамадзянскія дзеячы. Паслухаць рады старых людзей, каб паказалі нам нашыя памылкі—кожны з нас рад.

А ці-ж яны прышлі да нас, як старэйшыя, як людзі з практыкай?

Дыла. Дайце мне слова.

Чарот. Калі ласка.

Дыла. Чаму няма прадстаўнікоў Інбелкульту, я дзіўлюся. Прышоў я на сход асабіста, не ад прэзыдыуму.

Александровіч. Я выношу прапанову адазваць „Маладняк“ з Інбелкульту...

Чарот. Будзем галасаваць?

Голас з месца. Я прапаную перадаць у організацыйную комісію. (Прапанова прынята).

Чарот. Таварышы, заўтра аб 11 гадзіне раніцы пачнуць працаваць дзьве комісіі: організацыйная і выхаваўчая, пасьля чаго адбудзецца апошняе пасяджэньне нашага пленуму. Сёньня-ж, а 7 гадзіне, у Клюбе К. Маркса будзем сьвяткаваць 15-гадовы юбілей літаратурнай працы А. Гурло—маладнякоўца...

**Вечар, ахвяраваны пятнаццацігадоваму юбілею літаратурнай чыннасьці Алеся Гурло.**

Народу поўная заля... У прэзыдыуме ўсе выдатнейшыя дзеячы Менску.

З дакладам аб жыцьці юбіляра выступае яго сябра па „Маладняку“ Н. Чарнушэвіч.

Доўга і уважна спыняецца на галоўных момантах у жыцьці поэты. Робіць вытрымкі з яго твораў, якія так ці йначай характарызуюць настроі ў той час Алеся Гурло.

З другім дакладам аб творчасьці юбіляра выступіў проф. Пятуховіч. Маляўніча, з вялікім уздымам спыняецца на характэрных рысах музы поэты.

Далей выступілі з прывітаньнямі:

М. Чарот ад імя пленуму ЦБ „Маладняка“.

Ул. Дубоўка ад Маскоўскай філіі „Маладняка“.

Тав. Арабей ад Беларускай дывізіі.

Тав. Смоліч ад імя Інбелкульту.

Тав. Мялешка ад імя колектыву беларускіх настаўнікаў г. Менску і інш.

Нясьціханымі воплескамі спаткала заля пісьмовае прывітаньне Старшыні Савету Народных Камісараў БССР т. Адамовіча.

**Ўсебеларускаму аб'яднаньню поэтаў і пісьменьнікаў „МАЛАДНЯК“.**

Беларуская культура цэлыя стагодзьдзі была пад уціскам польскае, а затым расійскае дзяржаўнасьці. Кастрычнікавая рэволюцыя параўнала ўсе нацыі, насяляючыя абшары б. Расійскае імпэрыі і дала ім магчымасьць самастойнага існаваньня і разьвіцьця свайго экономічнага і культурнага жыцьця. Імкненьні Савецкага ураду і Комуністычнае партыі накіраваны, каб як найхутчэй пры дапамозе ўсіх культурных сіл Рабоча-сялянскае дзяржавы, падняць гэта экономічнае і культурнае жыцьцё. Аднэй з гэтых сіл, досыць значнаю, зьяўляюцца *маладнякоўцы.*

У дзень юбілейнага сьвяткаваньня шчыра вітаю прадстаўніка „*Маладняка*“ поэту *Алеся Гурло* і жадаю яму доўгагадовае працы на карысьць беларускага працоўнага народу.

Старшыня Савету Народных Камісараў Беларускае С.С. Рэспублікі *Я. Адамовіч.*

Далей ішла чытка вершаў, пасьвечаных юбіляру.

Выступіў з музыкальнымі нумарамі настаўнік музычнага тэхнікуму Бясьсьмертны, Сэлях і інш.

Хор Белпэдтэхнікуму прапяяў некалькі нумароў народных песень.

**Апошняе пасяджэньне пленуму 23 сакавіка.**

Пасьля працы комісій, а першай гадзіне дня адчыняецца пасяджэньне пленуму.

Чарот. Чарговае пытаньне пленуму: прыняцьце рэзолюцыі. Для зачытваньня рэзолюцыі па дакладу т. Бабарэкі слова мае сам дакладчык Бабарэка.

# „Маладняк“ і яго месца ў літаратуры.

**Рэзолюцыя па дакладу А. Бабарэкі, прынятая пленумам Усебеларускага аб'яднаньня поэтаў і пісьменьнікаў „Маладняк“ 23-га сакавіка 1925 году.**

1) Мастацкая літаратура ў руках рабочых і сялян зьяўляецца зброяй клясавай барацьбы і соцыялістычнага будаўніцтва.

2) Асаблівасьць у разьвіцьці беларускага грамадзкага і нацыянальнага руху да Кастрычнікавай рэволюцыі накладае адбітак на мастацкую літаратуру,—стварае напрамак—*адраджанізм.*

3) Пад уплывам выхаду работніцкай клясы на арэну грамадзкага руху адраджанізм у літаратуры распадаецца на дзьве плыні без абасабленьня ў асобныя напрамкі. Адна плынь (чысты адраджанізм) характарызуецца імкненнасьцю да адраджэньня Беларусі, як самамэты. Другая плынь—імкненнасьцю да соцыяльнага вызваленьня, як канчатковай мэты, і адраджэньне прымае, як адзін з сродкаў да ажыцьцяўленьня гэтай мэты.

4) Кастрычнікавая рэволюцыя высоўвае новыя задачы перад літаратурай і разьвівае літаратуру рэволюцыйную. Плынь чыстага адраджанізму заціхае, а потым выбіваецца ў выглядзе самамэтных напрамкаў сымболізму, романтызму і т. п. Выплываюць новыя мастацкія сілы з гушчы працоўных мас, якія і твораць кастрычнікавую літаратуру.

5) Гэтыя новыя маладыя сілы ўзьнімаюць сьцяг станаўленьня маладога жыцьця, у васнову літаратурнай працы кладуць колектывізм, жыцьцятворчасьць і жыцьцярадаснасьць. Нараджаецца „Маладняк“.

6) Змаганьне „Маладняка“ за панаваньне ў беларускай літаратуры пролетарскай ідэолёгіі вылілася ў новы літаратурна-грамадзкі напрамак, які заняў на загонах беларускай літаратуры цьвёрдае і сталае месца.

7) Адмаўленьне яго існаваньня прыводзіць да адмаўленьня формы і напрамку ў беларускай літаратуры, якія зьвязаны з эпохай пролетарскай дыктатуры.

8) Гэты новы літаратурна-грамадзкі напрамак характарызуецца ўбіраньнем у сябе ўсяго цэннага і прогрэсыўнага

з папярэдняй літаратуры, яго пераапрацоўкаю і творчасьцю новай маладой формы мастацкай літаратуры, якая адпавядае новым соцыяльным умовам жыцьця. Новы літаратурна-грамадзкі напрамак „Маладняка“—гэта форма, у якой матар'ялізуецца, а праз гэта і об'ектывізуецца клясавая сьвядомасьць пролетарска-сялянскай клясы ў эпоху Кастрычніка на Беларусі.

9) У адносінах да прадстаўнікоў іншых літаратурных напрамкаў „Маладняк“ ставіцца: а) у няпрымірымую барацьбу з насіцелямі буржуазнай або мяшчанскай ідэолёгіі і б) супрацоўнічае з тымі, хто выяўляе нахіл да перабарэньня гэтай ідэолёгіі і ўспрыняцьця пролетарскай.

10) „Маладняк“ яднае ўсе літаратурныя сілы пролетарска-сялянскае клясы па адзінай ідэолёгічнай аснове і стаіць пад знакам далейшага ўзросту. „Маладняк“ абапіраецца на масавы рух пролетарска-сялянскай моладзі.

11) „Маладняк“ мае адну мэту: служыць справе рэволюцыі, справе перамогі пролетарыяту і сялянства, змагацца з усімі ворагамі рэволюцыі сродкамі беларускай мастацкай літаратуры для пабудаваньня соцыялістычнага ладу жыцьця.

---

Чарот. У каго ёсьць папраўкі ці дабаўкі да рэзолюцыі.

Дубоўка. Дазьвольце мне.

Чарот. Калі ласка.

Дубоўка. Ні ў якім разе нельга прыняць нам афармленьне нашай організацыі тэрмінам „маладнякізм“.

Далей т. Дубоўка пачынае пацьвярджаць свае думкі папярэднімі довадамі.

Па рэзолюцыі разьвіваецца цэлая дыскусія аб прыняцьці тэрміна „маладнякізм“.

Пытаньне ставіцца на галасаваньне.

Тэрмін „маладнякізм“ адхілаецца пленумам. Застаецца тэрмін „Маладняк“.

Чарот. Для зачытваньня рэзолюцыі па справаздачы ЦБ слова мае т. Вольны.

Т. Вольны. Зачытвае рэзолюцыю, якая ўхваляецца ўсімі галасамі.

**Рэзолюцыя прынятая па справаздачы ЦБ.**

Старая беларуская літаратура ў свой час зрабіла вялікую справу, як прогрэсыўная сіла. Пасьля Кастрычнікавай рэволюцыі яна з ідэолёгічнага боку не зьяўляецца дзейнічай сілаю на пролетарскім ідэолёгічнымм фронце.

Галоўная мэта „Малядняка“ была і ёсьць—утварыць кастрычнікаўскую літаратуру на Беларусі. „Малядняк“ за год працы галоўнай сваёй мэты дасягнуў: кастрычнікаўская літа-

ратура на Беларусі ёсьць; яна з кожным днём мацнее і заваёўвае сабе ўсё большыя колы чытачоў.

У часе нападкаў на „Маладняк“ і спрэчак са старою літаратураю „Малядняк“ выходзіў з правіловых позыцый.

Кастрычнікаўская рэволюцыя выбіла глебу з-пад ног старой літаратуры. Асноўныя мотывы старой літаратуры былі пераважна—падтрыманьне дробна-ўласьніцкіх імкненьняў сялянства і нацыянальнае адраджэньне.

Кастрычнікаўская рэволюцыя папершае дала ўладу рабочым і сялянам, падругое — правілова вырашыла нацыянальнае пытаньне ў умовах дыктатуры пролетарыяту і гэтым выбіла крыніцы натхненьня старой літаратуры.

„Маладняк“ выходзіць з клясавага сьветапагляду на літаратуру. Цьвёрдую клясавую лінію „Маладняка“ ў адносінах да старой літаратуры і яе прадстаўнікоў—ухваліць.

### Організацыйная праца.

Ня гледзячы на тое, што „Маладняк“ працаваў у цяжкіх умовах без ўсялякай матар‘яльнай дапамогі, дзякуючы *моральнай* дапамозе партыі і комсамолу, ім за мінулы год праведзена вялікая організацыйная праца па ўтварэньні маладнякоўскіх філій у акругах і ўзмацаваньні маладнякоўскага ядра.

Факт росту „Маладняка“ за кошт рабочых і сялян за год з 7 ініцыятараў да 200 чал. (апрача студыйцаў), а таксама факты організацыі філій у Магілеве, Віцебску, Полацку, Маскве, Бабруйску, Горках, Барысаве,—гавораць за тое, што „Маладняк“ стаіць на правіловым пролетарска-клясавым грунце, увесь час узрастаючы за кошт рабоча-сялянскіх мас.

Константаваць, што „Маладняк“ у організацыйных галінах перарос сябе, як літаратурнае аб‘яднаньне, што сьведчаць факты організацыі тэатральнай, музычнай і інш. сэкцый пры „Маладняку“.

Ухваліць лінію ЦБ па ўтварэньні пры „Маладняку“ сэкцый нацменшасьцяй на Беларусі.

### Выхаваўчая праца.

Дзякуючы адсутнасьці сродкаў, „Маладняк“ выхаваўчую працу вёў ня ў плянавым парадку.

За выхаваўчую працу, як наогул за філіі, адпавядалі вылучаныя „Маладняком“ кіраўнікі, якія былі ў сувязі з ЦБ. Пэрыодычныя выезды маладнякоўцаў з Менску, давалі магчымасьць месцам правілова праводзіць выхаваўчую лінію „Маладняка“.

Адначасна трэба адзначыць поўную слабасьць выдавецкае працы, якая тлумачыцца бойкотам „Маладняка“ збоку выдавецкіх устаноў.

Чарот. Чарговая рэзолюцыя аб арганізацыйным пляне далейшай працы.

Слова мае т. Ажгірэй.

Т. Ажгірэй зачытвае рэзолюцыю, якая ухваляецца ўсімі галасамі.

**Арганізацыйны плян далейшае працы.**

1. Выявіць у працягу месяца магчымасьці арганізацыі філій у тых акругах, дзе іх яшчэ няма.

2. Узмацаваць асноўнае ядро „Маладняка“, для чаго спыніць прыём у сябры непасрэдна і перагледзіць сучасны склад „Маладняка“.

3. Правесьці падрыхтоўчую кампанію па скліканьні зьезду „Маладняка“ ў траўні месяцы.

4. Узмацаваць працу па арганізацыі сэкцый: тэатральнай, музычнай, мастацкай і інш.

5. Аб'яднаць усіх пісьменьнікаў нацменшасьцяй, якія стаяць на аднэй з намі ідэолёгічнай пляцформе, шляхам утварэньня пры „Маладняку“ сэкцый: жыдоўскай, польскай, расійскай і інш.

6. Прыняць заходы ў пагоджанасьці з Галоўпалітасьветай да ўтварэньня маладнякоўскіх літгурткоў, драмгурткоў і хораў пры рабочым клюбе і хаце-чытальне, трымаючы цесную сувязь з рабочымі і селькорамі.

7. Узмацніць інструктаваньне філій. Дзеля гэтага трэба наладзіць перапіску і перасылку літаратуры, а таксама арганізаваць выезды сяброў ЦБ і пашырыць інформацыі ў прэсе.

8. Трымаць самую цесную сувязь з адзіночкамі.

Чарот. Рэзолюцыя аб выхаваўчым пляне далейшае працы. Слова мае Бабарэка.

У рэзолюцыі выкідаецца тэрмін „маладнякізм“, і рэзолюцыя прымаецца аднагалосна.

## Праграмны плян працы Ўсебеларускага аб'яднаньня паэтаў і пісьменьнікаў „Маладняка“.

### I.

**Крытычна-дасьледчая праца.**

У васнову крытычна-дасьледчай працы аб'яднаньне кладзе марксыцкі мэтод, выкарыстоўваючы ўсе іншыя мэтоды дасьледваньня мастацкіх твораў, як падсобныя прыёмы і спосабы.

На падставе марксыцкага мэтоду ў аб'яднаньні павінна праводзіцца:

1. Вывучэньне і дасьледваньне ўсіх мастацкіх форм і прыёмаў творчасьці выдатных пісьменьнікаў, літаратурных

школ і напрамкаў як сучасных, так і адышоўшых ужо ў гісторыю сусьветнай літаратуры.

Гэта вывучэньне праводзіцца па такіх галінах: тэматыка, композыцыя, сыстэмы мотывіровак, лексыка, рытміка, інструмантоўка, стыль, поэтычны сынтакс, літаратурныя жанры.

2. Дасьледваньне эмоцыянальнай значымасьці мастацкіх форм як у цэлым, так і асобных прыёмаў творчасьці.

Тут патрэбна ўстанаўленьне—якому парадку пачуцьцяў і мысьлей адпавядаюць тыя ці іншыя мастацкія прыёмы творчасьці. Поруч-жа неабходна праводзіць устанаўленьне іх соцыяльнай абумоўленасьці і месца ў гістарычным разьвіцьці грамады, клясы.

3. Дасьледваньне і вывучэньне поэтыкі беларускай народнай творчасьці і поэтыкі найноўшага беларускага прыгожага пісьменства.

4. Распрацоўка поэтыкі маладнякоўцаў, як сыстэмы мастацкіх прыёмаў, прасякнутых эмоцыянальнай ідэёвасьцю, што організоўваюць пачуцьці, думкі і волю ў бок імкненнасьці да будаваньня соцыялістычнага ладу і служаць клясаваму самапазнаньню.

5. Крытыка найноўшых мастацкіх твораў беларускіх пісьменьнікаў як старэйшага пакаленьня, так і малодшага.

Поруч з гэтай крытычна-дасьледчай працай павінна праводзіцца і творча-ілюстрацыйная, іначай кажучы, вопытна-практычная: пісаньне твораў, як ілюстрацый апанованьня тымі ці іншымі мастацкімі формамі або прыёмамі творчасьці.

II

## Мастацка-творчая праца

сяброў аб'яднаньня праводзіцца як індывідуальна, так і колектыўна.

1. Стварэньне мастацкіх твораў, што адбівалі-б жыцьцё пролетарыяту й сялянства і іншых клясавых груповак у пролетарскім асьвятленьні. Тэмы выбіраюцца як індывідуальна кожным сябром, так вызначаюцца і колектывам на конкурс.

2. Зьбіраньне матар'ялаў для мастацкіх твораў з нагляданьняў над праявамі жыцьця ў рознастайных разрэзах яго, як па індывідуальным выбары тэмы, так і па колектыўных заданьнях. Формаю можа быць напісаньне нарысаў, малюнкаў, абразкоў і г. д.

3. Кіраўніцтва творча-мастацкаю працаю ўскладаецца на выхаваўчую комісію, якая павінна сачыць за напрамкам у працы асобных сяброў і накіроўвала яго ў правільнае русла.

III

## „Рэалізацыя“ працы.

Уся праца сяброў аб'яднаньня студыйна-лябараторнага характару павінна быць „рэалізована“, а для гэтага аб'яднаньне праводзіць:

1. Чыткі і разбор твораў як унутры „Маладняка“, так і сярод шырокіх працоўных мас у рабочых і сялянскіх клюбах.

2. Пляновыя крытычна-мастацкія вечары-дэмонстрацыі дасягненьняў у працы сяброў аб'яднаньня за пэўны пэрыод часу.

3. Вусныя маладнякоўскія газэты, альманахі.

4. Абслугоўваньне мастацкай творчасьцю грамадзянскіх падзей і кампаній.

5. Друкаваньне твораў у пэрыодычных выданьнях, літаратурныя старонкі ў газэтах, маладнякоўскія аддзелы ў часопісях і г. д.

6. Выданьне твораў маладнякоўцаў як асобна, так і колектыўнымі зборнічкамі.

7. Пэрыодычнае выданьне маладнякоўскага літаратурна-крытычнага альманаху.

## Дадатковае да пляну.

1. Другія сэкцыі „Маладняка“, як, напр.: музычная, выпрацоўвуюць плян для сябе ў згодзе з комісіямі выхаваўчае працы ў кожнай філіі.

2. Аб адзіночках. Даваць ім літаратуру, даваць напрамак працы. Яны самі павінны трымаць сувязь з філіяй, прысылаць туды свае творы і г. д.

3. Для кожнай філіі неабходна мець бібліотэчкі з літаратурай мастацкай і літаратурай па тэорыі літаратурнага мастацтва.

4. Дапамагаць другім сэкцыям „Маладняка“ беларусізавацца.

## Увага да тэзісаў:

Кожная філія і студыя прыстасоўвае гэты плян да сябе паколькі на гэта ёсьць магчымасьць...

Дубоўка: Дазвольце прапанаваць пленуму ад імя фракцыі рэзолюцыю аб адносінах нашых да Інбелкульту.

## Рэзолюцыя пленуму аб адносінах „Маладняка“ да Інбелкульту.

1. Пленум „Маладняка“ лічыць не мэтазгодным існаваньне „Маладняка“ ў якасьці сэкцыі Інбелкульту і выказваецца за выхад і афармаваньне ў самастойную організацыю. Прычынаю зьяўляецца тое, што Інбелкульт вядзе акадэміч-

ную працу па дасьледваньню і вывучэньню беларускае культуры, у той час, як „Маладняк“ практычна працуе над яе разьвіцьцём і пашырэньнем.

2. „Маладняк“ у цэлым, наколькі хопіць магчымасьці, будзе дапамагаць Інбелкульту ў яго працы шляхам удзелу ў сэкцыях.

3. Пленум даручае ЦБ высьветліць гэтае пытаньне ўсебакова і перадаць яго на канчатковае зацьверджаньне Усебеларускага Маладняцкага зьезду, які адбудзецца ў траўні 1925 г. (Рэзолюцыя прымаецца пленумам без папраўак).

Ч а р о т. Наступным пытаньнем стаіць у нас на павестцы дня пытаньне аб рэорганізацыі ЦБ.

Ад імя фракцыі т. Зарэцкі агалашае сьпіс кандыдатаў ЦБ.

Ч а р о т. Другія сьпісы ёсьць? (Няма). Галасую.

Сьпіс прымаецца аднагалосна.

У новае ЦБ ўваходзяць—

Сябрамі ЦБ: 1. Чарот, 2. Дубоўка, 3. Зарэцкі, 4. Александровіч, 5. Бабарэка, 6. Вольны, 7. Чарнушэвіч.

Кандыдаты: 1. Гурло, 2. Каплан, 3. Мурашкевіч, 4. Дудар.

Ч а р о т. Бягучыя справы. Першае пытаньне:

Інформацыя аб зьезьдзе „Гарту“. Слова мае Я. Пушча.

Тав. Пушча перадае свае ўражаньні аб украінскай сучаснай культуры. Культура украінская значна шырэй разьвярнулася, чым у нас на Беларусі. Гэта тлумачыцца тым, што яны больш моцныя з матар'яльнага боку.

Далей т. Пушча падзяляецца з пленумам уражаньнямі ад зьезду „Гарту“.

Тав. Дубоўка дапаўняе слова Пушчы новымі ўражаньнямі і пастаноўкаю справы на зьезьдзе і ў організацыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў Украіны „Гарт“.

Ч а р о т. Слова для прывітаньня пленуму мае сакратар ЦК КПБ т. Крыніцкі.

К р ы н і ц к і. На „Маладняк“ мы бярэм курс у справе адбудаваньня новай беларускай культуры. Маладнякоўцы— дзеці рабочых і сялян, таму партыя і ўскладае на іх вялікія надзеі.

„Маладняк“ не павінен цалкам ісьці ў разрэз з старою культурай. Ён павінен яе ўмела скарыстаць, выбраць з яе самае лепшае, што можа быць прыгодна для нашых дасягненьняў у справе завяршэньня Кастрычніка.

Партыя жадае бачыць „Маладняк“ актыўным удзельнікам у справе будаваньня беларускай культуры.

Партыя спадзяецца, што „Маладняк“ будзе карыстацца тымі формамі і языком, якія будуць зразумелымі для мас. Язык наш трэба апрацоўваць. Але не акадэмічна. Язык трэба браць жывы, народны.

Партыя з свайго боку будзе падтрымліваць „Маладняк“.

Чарот (Адказ т. Крыніцкаму).

Тая лінія, якую вядзе „Маладняк“—правіловая. Наша лінія грунтавалася на дырэктывах Комсамолу і Партыі.

Мы ня будзем ісьці на ражны са старым. Мы толькі маладняцкім аршынам будзем мераць старое: трэба—адрэжам, а трэба—даточым.

Наша просьба да Партыі і Комсамолу—прыходзіць да нас і вучыць нас, выпраўляць нашыя памылкі, калі яны часамі змогуць украсьціся.

Чарот. Далей павінен быў быць мой даклад аб адносінах „Маладняка“ да аб'яднаньня пісьменьнікаў СССР. Але ў зьвязку з тым, што Партыя яшчэ ня выказала сваіх паглядӑ на гэтае пытаньне, мы яго вырашаць ня будзем. Аставім гэтае пытаньне да нашага зьезду, калі, магчыма, Партыя ўжо выкажа свой пагляд.

Прымаецца наступная рэзолюцыя:

Пытаньне аб узаемаадносінах „Маладняка“ з іншымі аб'яднаньнямі пролетарскіх пісьменьнікаў паставіць на канчатковае вырашэньне Ўсебеларускага зьезду поэтаў і пісьменьнікаў „Маладнак“.

Пленум даручае Цэнтральнаму Бюро трымаць сувязь з тымі організацыямі, якія дапамагаюць „Маладняку“ ў яго працы, а ў першую чаргу з аб'яднаньнем пісьменьнікаў Украіны „Гарт“.

Тав. Александровіч. Дазвольце перадаць пленуму рэзолюцыю Менскай філіі „Маладняк“ па пытаньні аб збойкотаваньні старымі культурнікамі Маладнякоўскага пленуму.

## Рэзолюцыя Менскай філіі „Маладняка“.

Сход Менскай філіі „Маладняка“, заслухаўшы інформацыю тав. Ажгірэя аб бойкотаваньні пленуму ЦБ і сыстэматычных выпадах супроць „Маладняка“ збоку старых беларускіх культурнікаў, лічыць такія адносіны шкоднымі для далейшага разьвіцьця беларускай пролетарскай культуры.

Прымаючы пад увагу вялікую працу, зробленую пленумам, Менская філія вітае пленум ЦБ і выказвае абурэньне супроць бойкотаваньня пленуму старымі беларускімі культурнікамі-працаўнікамі. У вадказ на гэта, маладнякоўцы Менскай філіі яшчэ энэргічней павядуць колектыўную працу па будаваньні маладой, здаровай беларускай культуры.

Што здарава—то жыцьцёва,  
Што гнілое—вон з жыцьця...

Вольны. Дазвольце прапанаваць, таварышы, нашу рэзолюцыю па гэтым пытаньні.

**Рэзолюцыя па пытаньні аб адносінах старых культурнікаў да Пленуму.**

*Пленум „Маладняка“ ганьбуе факт збойкотаваньня Інбелкультам Пленуму „Маладняка“.*

Пададбед. Дазвольце, таварышы, прапанаваць на вашу увагу проэкт прывітаньня аднаму з правадыроў рабоча-сялянскіх мас Беларусі т. Адамовічу.

**Старшыні Савету Народных Камісараў БССР т. Адамовічу.**

Паважаны таварыш! Пленум Цэнтральнага Бюро Усебеларускага аб'яднаньня поэтаў і пісьменьнікаў „Маладняк“, заслухаўшы Ваш прывітальны ліст у зьвязку з працаю „Маладняка“ і юбілеем сябра нашага Алеся Гурло, запаўняе Вас, што і ў далейшым мы будзем няўхільна імкнуцца да пашырэньня і разьвіцьця беларускае пролетарскае культуры пад сьцягам Комуністычнай Партыі, як і да гэтага часу.

Пленум выказвае надзею, што правадыры Партыі і Савецкае Ўлады будуць зьвяртаць увагу на нашу працу шляхам таварыскай рады і моральнай дапамогі.

Ваша таварыскае прывітаньне зьяўляецца для нас залогам гэтага.

Прывітаньне прымаецца ўсімі галасамі, пад гучныя воплескі.

Якімовіч. Прапаную, таварышы, паслаць прывітаньне

**Цэнтральнаму Комітэту Комуністычнай Партыі Беларусі.**

Пленум Цэнтральнага Бюро Ўсебеларускага аб'яднаньня поэтаў і пісьменьнікаў „Маладняк“ вітае правадыроў Комуністычнай Партыі Беларусі, пад ідэёвым кіраўніцтвам і пры моральнай дапамозе якіх вёў сваю працу „Маладняк“ і павядзе яе ў далейшым.

Хай жыве Кастрычнік!

Хай жыве Комуністычная Партыя!

Пяруністымі воплескамі спаткала саля проэкт прывітаньня, які ўхвалёны ўсімі галасамі.

Чарот. Таварышы! Як зазначаюць і нашыя апошнія рэзолюцыі, мы вялі да гэтага часу сваю працу і будзем весьці яе на далей на грунце заветаў т. Леніна і пад ідэёвым кіраўніцтвам Комуністычнай Партыі.

Выступленьні на пленуме т. Ігнатоўскага, т. Крыніцкага і пісьмовае прывітаньне т. Адамовіча сьведчаць аб тым, што гэтае кіраўніцтва і моральная дапамога нам забясьпечаны.

Напружым-жа свае сілы, выявім свае здольнасьці, развінём як мага шырэй і інтэнсыўней сваю працу, каб апраўдаць тыя надзеі, якія ўскладаюць на нас і рабоча-сялянскія масы, і яе правадыр—Комуністычная Партыя Беларусі.

(Голас з месца. Прапаную прасьпяваць Міжнародны гымн).

Чарот. Абвяшчаю Пленум Цэнтральнага Бюро Ўсебеларускага аб'яднаньня поэтаў і пісьменьнікаў „Маладняк“ зачыненым.

(Прысутныя сьпяваюць Міжнародны гымн).

## Протокол першага пасяджэньня новага цэнтральнага бюро

*24 сакавіка 1925 г.*

Прысутнымі былі: У. Дубоўка, А. Вольны, Зарэцкі, А. Бабарэка, Н. Чарнушэвіч, А. Александровіч, А. Дудар, Я. Пушча.

**Старшыня—А. Вольны.**

**Сакратар—Я. Падабед.**

Парадак дня:

1. Выбары сакратарыяту.
2. Выбары комісій і разьмеркаваньне абавязкаў.
3. Выданьне бюлетэню пленуму.
4. Аб штатах сакратарыяту.
5. Каштарыс на 1925-26 г.
6. Памяшкачьне.
7. Бягучыя справы.

| Слухалі: | Ухвалілі: |
|---|---|
| 1. А. Вольны: сакратарыят трэба выбраць з трох асоб і аднаго кандыдата. Кандыдатуры: А. Вольны, У. Дубоўка, А. Александровіч, М. Чарот. На чале сакратарыяту павінен стаяць адказны сакратар. | 1. Сябрамі сакратарыяту абралі: У. Дубоўку, М. Чарота і А. Вольнага, кандыдатам—А. Александровіча. На пасаду адказнага сакратара сакратарыяту абраны т. Дубоўка. |
| 2. А. Вольны: Апрача сакратарыяту ў ЦБ павінны быць яшчэ такія комісіі: організацыйная, выхаваўчая і выдавецкая. | 2. Функцыі оргкомісіі ўскладаюцца на сакратарыят. Выхаваўчую — выбраць з трох асоб: А. Бабарэкі, Зарэцкага і Я. Пушчы. На чале комісіі стаіць А. Бабарэка. Выдавецкую—таксама з трох асоб: А. Чарнушэвіча, А. Александровіча і Якімовіча. На чале комісіі стаіць А. Чарнушэвіч. |

| Слухалі: | Ухвалілі: |
| --- | --- |
| 3. Выданьне бюлетэню пленуму. | 3. Даручаецца выдавецкай комісіі разам з сакратарыятам пленуму. |
| 4. Аб штатах сакратарыяту. А. Вольны: У сувязі з тым, што зараз „Маладняк“ зьяўляецца маладняком беларускае культуры, а ня толькі літаратурным аб‘яднаньнем, дзеля гэтага павінны мы паставіць двух сяброў, якія-б выключна былі заняты маладняцкай працай. | 4. Даручыць сакратарыяту дастаць дзьве штатных пасады для адказнага сакратара і для літсакратара. Апошнім застаецца Я. Пушча з захаваньнем стаўкі Інбелкульту. |
| 5. Аб памяшканьні. | 5. Даручыць сакратарыяту вырашыць гэтае пытаньне ў тэрміновым парадку. |
| 6. Каштарыс на 1925-26 бюджэтны год. | 6. Кожная комісія павінна ў тэрміновым парадку прадставіць свой каштарыс у сакратарыят, на грунце якіх скласьці агульны каштарыс „Маладняка“. |
| 7. Бягучыя справы. | 7. Для лепшага азнаямленьня з працаю кожнай філіі даручыць сябрам ЦБ пагутарыць вусна з кіраўнікамі філій. Александровічу—Магілеўская Чарнушэвічу—Полацкая, Бабарэку—Бабруйская. |
| а) аб прымацаваньні сяброў ЦБ да філій. | а) У далейшым да кожнае слабое філіі прымацаваць сябра ЦБ. |
| б) Аб скідцы на кніжкі для маладнякоўцаў. | б) Даручыць сакратарыяту разгледзець гэтае пытаньне |

Старшыня пасяджэньня **А. Вольны.**

Сакратар **Я. Падабед.**

161486

~~173357~~

Бел. аддзел
Аутомат.

1964 г.

Бел. аддзел
1994 г.

B000000 1962 113